СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 6.31, 19.43, 13.12;
Віцебск — 6.19, 19.34, 13.15;
Магілёў — 6.20, 19.32, 13.12;
Гомель — 6.21, 19.25, 13.04;
Гродна — 6.48, 20.55, 13.07;
Брэст — 6.49, 19.56, 13.07.
МЕСЯЦ:
Першая квадра 4 верасня.
ІМЯНІНЫ:
Пімена, Анфісы, Савы.

ЗВЯЗДА

9 ВЕРАСНЯ 1992 г.
серада, № 181 (21959)
● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВОЗГАЛАС

ДОБРАЯ РАБОТА—ДОБРАЯ ЗАРПЛАТА

ЖЛОБІН. Адміністрацыя Беларускага металургічнага завода прыняла рашэнне павялічыць аклады, аплату за начныя і вячэрнія змены ў 2 разы, па здзельных расцэнках—ў 1,9 раза. Такім чынам, сярэдняя зарплата па заводзе зараз складае 11—12 тысяч рублёў, што ў 25 разоў больш, чым у мінулым годзе.

Папаўненне ў дыпламатычным корпусе

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛІНФАРМА ў Міністэрстве замежных спраў рэспублікі, заўтра, 9 верасня, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Злучаных Штатаў Амерыкі ў Беларусі Дэвід Х. Суорц мае намер уручыць вярыцельныя граматы Старшыні беларускага парламента Станіславу Шушкевічу.

Амерыканскаму паслу пяцьдзесят гадоў. Ён знаёмы з Беларуссю, таму што з вясны гэтага года быў тут часовым павераным у справах ЗША. Дарэчы, амерыканскія дыпламаты, узначальваемыя Дэвідам Х. Суорцам, сталі першымі замежнымі прадстаўнікамі, акрэдытаванымі ў Мінску.

БЕЛІНФАРМ.

ПЕРШАКЛАСНЫ ПОЛЬСКІ...

БРЭСТ. Клас з выкладаннем на польскай мове адкрыўся ў адной са школ горада. 19 першакласнікаў будуць займацца па праграме пачатковай школы Рэспублікі Польшча. Міністэрства адукацыі суседняй краіны паабяцала забяспечыць юных брастаўчан падручнікамі і прысылаць вопытнага настаўніка. Пакуль першакласнікі яшчэ не авалодалі польскай мовай, некаторыя прадметы выкладаюцца на беларускай.

Таццяна ГУСЕВА. (РІД).

І СЯРОД БАНКАЎ БЫВАЮЦЬ «НЕПАТРЫЁТЫ»...

На чарговым пасяджэнні планава-бюджэтнай камісіі ВС РБ павінён быў разглядацца бюджэт краіны на 1993 год, аднак на парадак дня вынеслі ўсё ж іншае пытанне: аб выніках праверкі работы камерцыйных банкаў па выкананню законаў і нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь аб банкаўскай дзейнасці.

Нацыянальная банкаўская сістэма ў Беларусі яшчэ маладая. Камерцыйныя банкі — першынцы рыначнай эканомікі — перажываюць пакуль нялёгкі час станаўлення, пошукаў, і на гэтым шляху, вядома, не пазбегнуць памылак. У дакладзе, зробленым спецыялістамі Нацыянальнага банка па выніках праверкі, адзначана, што крэдытныя аперацыі камерцыйных банкаў выраслі ў тры разы, але практычна не заўважана нарошчвання імі ўласнага капіталу, што сведчыць аб адсутнасці стабілізацыйных фактараў у рабоце. Большасць з гэтых банкаў мае капітал усяго каля 60 млн. рублёў — гэта вельмі мала.

Дрэнна працуюць камерцыйныя банкі і з каштоўнымі паперамі — «Прамбудбанк» прадаў іх усяго на 860 тысяч рублёў. Гэта што датычыць унутранага жыцця банкаў.

Цяпер — аб адпаведнасці іх дзейнасці заканадаўству. Законам прадугледжана, што ўсе ўклады насельніцтва ў камерцыйных банках павінны быць застрахаваны, аднак у «Мінскбізнесбанку», «Прыорбанку» пра гэта чамусьці «забыліся». Ёсць у нас, аказваецца, і проста «непатрыятычныя» банкі (менавіта такое слова прагучала ў дакладзе): свае крэдытныя аперацыі многія ўхітрыліся аформіць за межамі рэспублікі, што паспрыяла сплыванню сродкаў з краіны. І немалых — 400 млн. рублёў. Усё з-за недасканаласці нашага заканадаўства, — растлумачыў старшыня Асацыяцыі камерцыйных банкаў Яўген Купчын. Адным з пунктаў Закона РБ «Аб банкаўскай дзейнасці» праводзіць аперацыі за межамі рэспублікі нам дазволена, а ў той жа час пастановай Саўміна на тэрыторыі Беларусі гэта забаронена—каб не перапампоўваць грашовую масу з-за межаў рэспублікі. Але як бы там ні было, а 400 мільёнаў пайшлі на развіццё камерцыйнай дзейнасці ў Расіі, на Украіне, і зараз вярнуць гэтую суму ўжо вельмі праблематычна.

Узрастае сума пратэрмінаваных даўгоў камерцыйных банкаў — на сённяшні дзень яна складае звыш 600 млн. рублёў, і нічога не робіцца для стварэння прыбытку, дастатковага для пагашэння даўгоў.

Чым вытлумачыць усё гэта — нізкім узроўнем прафесіяналізму кіраўнікоў многіх банкаў ці простым жаданнем асабістага ўзбагачэння, нягледзячы ні на што? А ўся справа ў тым, лічыць старшыня Нацыянальнага банка Беларусі С. Багданкевіч, што сярод заснавальнікаў камерцыйных банкаў многа дзяржаўных структур, вось і жывуць тыя, не надта турбуючыся аб заўтрашнім дні, спадзеючыся на «ўліванне» дзяржаўных сродкаў у якасці крэдыту. Бестурботнасць, як бачым, часта суседнічае з бездапаможнасцю. А таму, прагучала прапанова, рэспубліцы вельмі патрэбен спецыяльны закон аб сістэме банкаўскага нагляду, каб гэта рабілася не наскокам, час ад часу, а пастаянна, і кіраўнікі камерцыйных банкаўскіх структур добра ведалі, за якія памылкі ў іх дзейнасці ім давядзецца расплачвацца грашыма, а за якія — нават ліквідацыяй банка.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ, кар. «Звязды».

«НАША ІНТЭГРАЦЫЯ Ў СУСВЕТНУЮ ЭКАНОМІКУ НЕМАГЧЫМА БЕЗ СТВАРЭННЯ СВАБОДНЫХ ЭКАНАМІЧНЫХ ЗОН»

Восем пытанняў было на парадку дня чарговага пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое адбылося ўчора. А адным з галоўных і першачарговых — абмеркаванне праекта закона аб свабодных эканамічных зонах на тэрыторыі рэспублікі. Гэта тэма даўно ўжо выклікала да сябе цікавасць. Яно і не дзіўна: як паказвае вопыт многіх краін, свабодная эканамічная зона стварае ўмовы для паскоранага развіцця вытворчых сіл, рыначных умоў гаспадарання, больш актыўнага інтэгравання ў сусветную эканоміку, інвестыцый замежнага капіталу.

Што ж прадугледжваецца для гэтага зрабіць? Найперш—увесці ў гэтай зоне льготнае падаткаабкладанне — вядома, не для ўсіх прадпрыемстваў, што існуюць у гэтым рэгіёне, а толькі для тых, чыя дзейнасць будзе спрыяць развіццю эканамічнага патэнцыялу зоны; прадугледжваецца таксама прадастаўленне крэдытаў; вызваленне тавараў ад пошліннага абкладання; спрошчаная сістэма рэгістрацыі малых і сумесных прадпрыемстваў, прадпрыемстваў са 100-працэнтнай доляй замежнага капіталу. А паўната ўлады ляжа на плечы Адміністрацыйнага савета, які і займецца вырашэннем усіх пытанняў.

Але як актыўна ў такіх умовах зможа ўмешвацца дзяржава ў ход вытворчых, гаспадарчых працэсаў, што будуць адбывацца ў СЭЗ? Міністра сувязі і інфарматыкі І. Грыцука цікавіла, напрыклад, хто будзе тут рэгламентаваць, як ён выказаўся, выхад газет, як будзе развівацца сувязь? На што міністру было адказана, што дыктаваць свае ўмовы ў гэтай зоне ён не зможа, інакш якая ж яна тады свабодная. Больш важкай была заўвага старшыні Нацыянальнага банка С. Багданкевіча, што грашовай адзінкай СЭЗ—рублём —у будучым можа быць сур'ёзна падарваны курс нацыянальнай валюты тут і на астатняй частцы тэрыторыі краіны. Пытанні ў сувязі з гэтым застаюцца, і яны даволі сур'ёзныя. Таму на працягу пэўнага часу праект будзе дапрацоўвацца заўвагамі і прапановамі.

Найбольш часу заняло абмеркаванне пытання аб сітуацыі з пажарамі. Прагучаў даклад штаба Грамадзянскай абароны. На сённяшні дзень на тэрыторыі краіны захоўваецца 218 ачагоў пажару (з іх 46 лясных, астатнія — тарфяныя) з агульнай плошчай 3.276 гектараў. Зараз можна сказаць, што сітуацыя кантролюецца, а таму можна зрабіць і некаторыя вывады. Слабая матэрыяльна - тэхнічная база, складанасці з фінансаваннем ды і звычайная безадказнасць кіраўнікоў (дырэктар аднаго з лясгасаў у Асіповіцкім раёне ў час, калі агонь знішчаў цэлы лясны масіў і набліжаўся да жылля, не знайшоў сабе іншага занятку, як ваяжыраваць па рэспектабельнай Галандыі) — прывялі да таго выніку, які мы маем. Канешне, пракуратура цяпер разбіраецца з некаторымі выпадкамі, узбуджаюцца крымінальныя справы, вінаватыя панясуць адказнасць. Але ж трэба думаць і аб заўтрашнім дні. Ужо гатова і Палажэнне аб рэжыме надзвычайнай сітуацыі, якое будзе прымяняцца ў экстрэмальных сітуацыях, звязаных не толькі з пажарамі.

Тут жа прагучала прапанова аб стварэнні ў Беларусі каля дзесятка спецыяльных батальёнаў (кожны колькасцю 220—240 чалавек), добра падрыхтаваных, аснашчаных, абучаных, якія былі б гатовы сустрэць і вытрымаць удар стыхіі. Магчыма, такія фарміраванні трэба стварыць у сістэме Міністэрства абароны, сказаў В. Кебіч, бо дзяржаўны бюджэт сёння не мае магчымасці іх утрымліваць. Але Старшыні Саўміна тут жа запярэчылі: вопыт замежных краін, у прыватнасці Германіі, сведчыць, што гэта павінна быць дзяржаўная служба, яна хутка акупіць сябе, займаючыся ў «мірны» час захаваннем радыяцыйных адходаў, рамонтам дарог, прафілактычнай работай. Акрамя пажараў, у нас здараюцца і іншыя стыхійныя бедствы: ураганы, напрыклад. У апошнюю нядзелю адзін з іх пранёсся па заходніх раёнах Беларусі: чалавечыя ахвяры, шматлікія разбурэнні: у калгасе «Перамога» Валожынскага раёна знішчана амаль цэлая вёска — страты 20 млн. рублёў. Зноў людзі аказаліся непадрыхтаванымі.

Прынята рашэнне: падрыхтаваць і прыняць вялікую пастанову Саўміна.

У другой палове дня Прэзідыум Савета Міністраў прыступіў да абмеркавання пытання аб эканамічнай сітуацыі ў краіне. Чытайце нашу справаздачу заўтра.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Амерыканская вада—самая чыстая вада ў свеце. І больш за ўсё неабходная нам

Гуманітарная дапамога, як мы пераконваемся ўсё часцей і часцей, можа быць рознай. Можа быць і такой, як на гэтым здымку. Паўтара літра абсалютна чыстай дыстыляванай стопрацэнтна амерыканскай вады знаходзілася ў гэтай бутэльцы. Амерыканцы, напэўна, думаюць, што мы пемрэем не толькі ад голаду, але і ад смагі. Таму і трымайце, былыя савецкія, сваю ваду! Крыўдна не столькі за амерыканцаў, якія пастаўляюць нам такі «дар», колькі за нас...

ЖАНЧЫНЫ ЗАЎСЁДЫ «КРАЙНІЯ»

ЖОДЗІНА. У мясцовы гарадскі цэнтр занятасці з пачатку года звярнулася 418 чалавек, з якіх 116 чалавек было працаўладкавана. Паводле даных, атрыманых з прадпрыемстваў горада, у мінулым годзе на іх было 763 свабодныя рабочыя месцы і 20 месцаў для ІТР і служачых, а ў гэтым годзе — адпаведна 252 і 40. На ўлік ў цэнтры занятасці зараз стаіць 340 чалавек, з якіх 180 жанчын, а вакансій для жанчын фактычна няма. Усім ім прапаноўвалася перавучыцца, аднак такое жаданне выказалі толькі 2 чалавекі. У Жодзіна афіцыяльна зарэгістравана толькі 49 беспрацоўных, з якіх 33 атрымліваюць дапамогу. І сярод іх пераважную большасць (30 чалавек) складаюць жанчыны.

Пятахціква—гэта клопат і аб «чарнобыльскіх» дзецях

МАГІЛЁЎ. Горад на Дняпры наведала дэлегацыя прафсаюзаў ізраільскага горада Пятахціква, якая падпісала з магілёўскім абласным саветам аб'яднання прафсаюзаў дагавор аб намерах. Галоўны пункт дагавора — абследаванне і лячэнне «чарнобыльскіх» дзяцей Магілёўшчыны ў Ізраілі. Акрамя таго, плануецца дапамога ізраільцян у вытворчасці на Беларусі медыкаментаў, медыцынскага абсталявання і інструментарыя.

Студэнтам «пагражае» партупея

Было аб'яўлена, што некаторыя з іх пасля заканчэння вучобы будуць служыць у арміі...

У прынцыпе супярэчнасці тут няма. Законам РБ «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» прадугледжваецца адтэрміноўка для студэнтаў дзённых аддзяленняў на час вучобы. Слухачы ваенных кафедраў ВНУ вызваляюцца ад службы ў арміі.

Нядаўна Міністэрства абароны і Міністэрства адукацыі Беларусі выдалі сумесны загад, па якому на ваенных кафедрах ВНУ спыняецца падрыхтоўка мотастралкоў і танкістаў. У асноўным гэта датычыць гуманітарных факультэтаў.

Як паведамілі ў Міністэрстве абароны, студэнты, якія пачалі вучобу на ваеннай кафедры, яе закончаць. Астатнія ж пасля заканчэння навучальнай установы будуць служыць у арміі на працягу 12 месяцаў.

Мікалай ЛЯЎЧУК, РІД.

Блакітны флаг ААН у Мінску

На адным з дамоў па вуліцы Кірава ў цэнтры Мінска развяваецца вядомы ўсяму свету блакітны флаг Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. 8 верасня тут адбылося ўрачыстае адкрыццё аддзялення ААН, ля ўваходу ў якое чырвоную рытуальную стужку разрэзаў адміністратар Праграмы развіцця ААН Уільям Дрэйпер, які прыбыў з Нью-Йорка.

— Беларусь першай з краін Садружнасці мае ў сябе наша прадстаўніцтва, — сказаў высокі госць. — І першай атрымлівае тэхнічную дапамогу ААН (ПРААН). У гэтай сувязі вашай рэспубліцы выдзелена 1,3 мільёна долараў. Мы ставім сваёй мэтай падтрымку намаганняў Беларусі, накіраваных на вырашэнне праблем эканамічнага развіцця, пераход да рыначнай сістэмы гаспадарання, паскарэнне сацыяльнага прагрэсу, павышэнне ўзроўню жыцця яе грамадзян і, самае галоўнае, дапамогу ў пераадоленні вынікаў чарнобыльскай катастрофы.

На ўрачыстай цырымоніі прысутнічалі міністры замежных спраў дзяржаў Садружнасці, якія прыбылі ў Мінск на чарговую сустрэчу ў рамках СНД.

Статус Курапат дагэтуль не вызначаны

Трэцяга ліпеня гэтага года «Звязда» паведамляла аб знішчэнні памятнага знака ў Курапатах.

Намеснік старшыні Камісіі па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны А. Трусаў пераслаў у рэдакцыю адказ КДБ па выкладзеных у газеце фактах. Намеснік старшыні КДБ РБ Г. Лавіцкі паведаміў, што звестак, якія датычылі б кампетэнцыі КДБ, не атрымана.

Да таго ж урочышча Курапаты дасюль не мае юрыдычнага статуса як могільніка, помніка ці іншага аб'екта, на тэрыторыі якіх проціпраўная дзейнасць асоб падпадала б пад артыкулы 88, 89 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях і артыкулы 224, 225 Крымінальнага кодэкса РБ.

Не акрэслены граніцы пахаванняў ахвяр і ведамасная прыналежнасць Курапат, таму адпаведныя органы не маюць магчымасці арганізаваць пастаянную ахову таго месца, дзе знаходзіўся памятны знак.

РАДЫЁ ФАКТ

Прэзідыум савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі падтрымаў рашэнне выканкома Еўрапейскага саюза беспрацоўных аб правядзенні 6 кастрычніка Дня дзеянняў па беспрацоўю. Праблема абароны ад беспрацоўя становіцца для нас рэальнасцю. Толькі з пачатку года колькасць занятых у народнай гаспадарцы зменшылася на 112 тысяч, па скарачэнню штатаў звольнена 41 тысяча чалавек. Паводле прагнозаў, да канца года без работы могуць застацца больш як 700 тысяч чалавек.

***

Урад Літвы адобрыў мемарандум аб эканамічнай палітыцы краіны. Праграма разлічана на год і складзена ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Міжнароднага валютнага фонду. Літва мяркуе, што ў выпадку зацвярджэння праграмы Міжнародным фондам, яна атрымае яшчэ ў гэтым фінансавым годзе крэдыты на суму 287 мільёнаў долараў.

Эстонскія прафсаюзы выступілі супраць намеру ўрада павысіць пенсійны ўзрост для мужчын і жанчын адпаведна да 65 і 60 гадоў. У накіраваным у адрас кабінета міністраў пратэсце змяшчаецца таксама патрабаванне падняць узровень мінімальнай заработнай платы да 300 эстонскіх крон у месяц. Па неафіцыяльнаму курсу 1 крона роўная сёння 12—14 рублям.

***

726 рублёў за кілаграм «Арбіты» плацяць зараз баранавіцкія курцы. І гэта не памылка... У магазінах баранавіцкага дзяржпаўгандлю прадаюць цыгарэты на вагу. Па падліках курцоў, са ста грамаў выходзіць пяць пачак. А адна пачка абыходзіцца прыкладна ў 14 рублёў 50 капеек.

***

Як паведамілі «Радыёфакту» ва ўрадавай службе інфармацыі, у Мінску з 26 па 30 кастрычніка намечана правесці міжнародную нараду экспертаў па пытаннях арганізацыі доследнай экалагічнай сеткі, якая будзе вывучаць праблемы ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай аварыі. Плануецца, што ў яе састаў увойдуць і каля 20 замежных вучоных і спецыялістаў.

***

У рэспубліцы створаны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы беларускіх спартсменаў да Алімпійскіх зімніх і летніх гульняў у 1994 і 1996 гадах. Узначаліў яго намеснік прэм'ер-міністра Станіслаў Брыль. У саставе камітэта таксама міністр замежных спраў Пётр Краўчанка, старшыня Дзяржкамспорту Уладзімір Рыжанкоў, міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Васіль Казакоў.

З АПТЫМІЗМАМ— У БУДУЧЫНЮ

НА ПЫТАННІ КАРЭСПАНДЭНТА «ЗВЯЗДЫ» АДКАЗВАЕ ДЫРЭКТАР ЗЕЛЕНАБОРСКАГА ЗАВОДА ПА ПЕРАПРАЦОЎЦЫ ТОРФУ А. КАСЦЮКОЎ.

На фоне той сапраўды ўсяленскай трывогі і занепакоенасці, што ахапіла краіну, з асаблівым пачуццём аптымізму ўспрымаем тыя вытворчыя калектывы, дзе насуперак эканамічным цяжкасцям, пагрозе беспрацоўя, усяму гэтаму бязладдзю, што ўзрушваюць асновы грамадства, панае здаровы дух творчасці і прагрэсу. Адным з такіх астраўкоў адноснай устойлівасці з'яўляецца Зеленаборскі завод па перапрацоўцы торфу. Прадпрыемства, якое яшчэ дзесятак гадоў назад было, што называецца, на мяжы краху, нечакана эканамічна акрэпла, пачало хуткімі тэмпамі развіваць свой вытворчы патэнцыял, ласпяхова вырашаць сацыяльныя праблемы. Гэтыя пераўтварэнні ўсе тут звязваюць з прыходам у калектыў тады яшчэ зусім маладога кіраўніка А. Касцюкова. Нас перш за ўсё зацікавіла, што ляжыць у аснове поспеху калектыву?

— Як гэта ні здаецца банальным, — звазначае Аляксандр Сяргеевіч, — але ўсе дасягненні ў асноўным звязаны з напружанай працай усяго калектыву. Колькі б мы не аддавалі анафеме нашу сістэму з яе жорсткай рэгламентацыяй і не захапляліся рынкам, нельга забываць, што ў аснове грандыёзных дасягненняў Японіі, Паўднёвай Карэі ляжыць прынцып эканамічнага планавання ў маштабах дзяржавы, доўгатэрміновых эканамічных прагнозаў. У той жа Паўднёвай Карэі паспяхова ажыццяўляюцца адна пяцігодка за другой, ад якіх мы адмахнуліся.

Матэрыялы аб жыцці працаўнікоў Зеленаборскага завода па перапрацоўцы торфу чытайце на 2-й старонцы.

На здымках:
Дырэктар Аляксандр Сяргеевіч КАСЦЮКОЎ.
Прадукцыя, падрыхтаваная для адпраўкі на экспарт.

«ЗВЯЗДА» Ў КАН'ЮНКТУРЫ ЧАСУ

ГОМЕЛЬ. Не так даўно гомельскія абласное і гарадское агенцтвы «Саюздруку» дадаткова заказалі для продажу ў розніцу 400 экземпляраў «Звязды». Наш уласны карэспандэнт У. Пернікаў звярнуўся да кіраўнікоў гэтых арганізацый Мікалая Ганчара і Кацярыны Грабянчук з пытаннем: чым выклікана такое рашэнне?

— Не сакрэт, што зараз кожны сочыць за кан'юнктурай рынку, г. зн., за тым таварам, які карыстаецца попытам. Адным з такіх тавараў для нас з'яўляюцца перыядычныя выданні. Дык вось, многія нашы хіяскёры пачалі дакладваць, што ў апошні час людзі актыўна купляюць «Звязду», а яны не могуць задаволіць іх попыт. Адсюль просьба: павялічце колькасць экземпляраў газеты для кіёскаў. І мы пайшлі насустрач.

— На ваш погляд, што прыцягнула ўвагу чытачоў?

— Многае. І ў першую чаргу тое, што «Звязда» трымае руку на пульсе жыцця. Яна апавядае аб усім, на нашу думку, аб'ектыўным, спакойным тонам. «Звязда» шукае шляхі да згоды, даючы слова прадстаўнікам усіх рухаў і партый, грамадскіх арганізацый. Думаецца, гэтым яна садзейнічае пераадоленню крызісу, які ахапіў наша грамадства, дапамагае ў пошуках выхаду з яго. Людзям падабаюцца таксама публікацыі карысных парад.

Немаловажна і тое, што апошнім часам на старонках газеты з'явілася некалькі цікавых матэрыялаў з жыцця вобласці. Спадзяёмся, што з цягам часу колькасць прыхільнікаў газеты будзе толькі расці.

Зварот беларускіх спартсменаў-алімпійцаў

Шаноўныя Станіслаў Станіслававіч і Вячаслаў Францавіч!

З пачуццём здзейсненага доўгу перад Рэспублікай Беларусь дакладваем, што беларуская каманда змагла паспяхова выступіць на XXV летніх Алімпійскіх гульнях. Гэта стала магчыма дзякуючы добрым спартыўным традыцыям у нашай рэспубліцы, паўсядзённаму клопату і падтрымцы дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, стварэнню ўмоў для вучэбна-трэніровачнай работы і падрыхтоўкі алімпійскага рэзерву.

У зборную каманду СНД было ўключана 60 мацнейшых спартсменаў рэспублікі па 18 відах спорту. У складаных кліматычных умовах і найвастрэйшай канкурэнтнай барацьбе імі было заваявана 17 залатых, 4 сярэбраныя і 6 бронзавых медалёў. Па колькасці атрыманых узнагарод наша рэспубліка ўвайшла ў дзесятку мацнейшых спартыўных дзяржаў свету.

У той жа час мы добра ведаем, што сённяшнія поспехі алімпійцаў — гэта ўжо гісторыя. Праз чатыры гады на чарговай XXVI Алімпіядзе ў Атланце (ЗША) спартсменам трэба будзе адстойваць і памнажаць спартыўную славу роднай Беларусі, выступаючы самастойнай камандай.

Выкананне гэтай надзвычай складанай задачы патрабуе карэннай перабудовы вучэбна-трэніровачнага працэсу, узмацнення работы трэнерскіх кадраў дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ і школ вышэйшага спартыўнага майстэрства, мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння збудаванняў, вырабу новага абсталявання і інвентару, спецыяльнай і масавай спартыўнай формы і, вядома, гарантаванага фінансавання праграмы развіцця фізічнай культуры і спорту.

На жаль, у сувязі з пераходам да рынку, ростам цэн, невырашэннем пытання льготнага падаткаабкладання прадпрыемстваў і арганізацый, якія ўкладваюць сродкі ў развіццё фізкультуры і спорту, увядзеннем шэрагу новых падаткаў, фізкультурна-спартыўная галіна пастаўлена на грань катастрофы. Унікальная сістэма фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-масавай работы, якая склалася за гады выканання «Комплекснай тэрытарыяльна-галіновай

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Ці будзе цёпла ў кватэрах нашых прыбалтыйскіх суседзяў

Пытанне няпростае як для ўрадаў, так і для насельніцтва Літвы і Латвіі. Паводле паведамленняў расійскага друку, напярэдадні асенне-зімовага сезона рэспублікі Балтыі ўдакладнялі з расійскімі партнёрамі цэны на энерганосьбіты. І вось 10 ліпеня расійскі бок паведаміў, што ў далейшым газ будзе пастаўляцца ў Латвію па новай цане — 90 долараў ЗША за тысячу кубаметраў газу з перадаплатай (сусветная цана — 110 долараў, так што мяжа павышэння яшчэ не дасягнута). Для Літвы расійскія партнёры паднялі цану на нафту да 19 тыс. рублёў за тону і збіраюцца давесці яе да ўзроўню сусветных цэн (30 тысяч рублёў за тону). Латвія для аплаты паставак вышуквае крэдыт у памеры 260 млн. долараў (цікава, як яна будзе яго аддаваць?), а Літва мае намер адмяніць датацыі насельніцтву на ацяпленне да сярэдзіны 1993 года, так што радавы грамадзянін гэтай рэспублікі павінен будзе плаціць за камунальныя паслугі ў 10—12 разоў больш, чым раней, і гэта яшчэ не мяжа шалёнага росту цэн. А хто будзе купляць прыбалтыйскія тавары па сусветных цэнах? Пытанні, пытанні...

А што ў нас будзе зімой? Гэтая праблема — прадмет пастаяннага галаўнога болю беларускага ўрада. Але сёння ўжо можна сказаць, што дзякуючы падпісаным прэм'ерам Кебічам пагадненням з расійскім урадам цэны на энерганосьбіты для Беларусі будуць такімі ж, як і для ўнутраных спажыўцоў у самой Расіі (а гэта ў 5—10 разоў ніжэй за сусветныя цэны). Гарантыю ад цэнавага бязмежжа даюць нам пагадненні аб парадку цэнаўтварэння на прадукцыю міжрэспубліканскага абмену, а таксама аб санкцыях за зрыў узаемапаставак. Акрамя таго, Расія ўзяла на сябе абслугоўванне і аплату знешняга доўгу рэспублікі. Дарэчы, калі б наш урад не дабіўся падпісання такога пагаднення, то ўжо к канцу года і на ўсю далейшую перспектыву валютная казна рэспублікі была б пустой.

Так што на пытанне, ці будзе цёпла ў нашых кватэрах зімой, можна адказаць сцвярджальна.

Аляксандр ПШАНІЧНЫ.

З аптымізмам — у будучыню

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Па-другое, поспех сёння ў многім, калі не ў рашаючай ступені, залежыць ад укаранення навейшых тэхналогій. Ці не таму і мы прадпрыемства, якое было зарыентавана на здабычу торфу, перапрафіляваліна яго перапрацоўку. Прычым на аснове найноўшых тэхналогій. Пабудавалі ў сябе лінію па вытворчасці тарфяных гаршчочкаў магутнасцю да 150 мільёнаў штук. А гэта прынесла мільённыя даходы. Попыт на гэтую прадукцыю нарастае ў геаметрычнай прагрэсіі, так што праблема збыту нас не хвалюе. Сёння, ва ўмовах жорсткіх экалагічных узрушэнняў, найвялікшай праблемай стала атрыманне экалагічна чыстай прадукцыі. А вырасціць яе можна толькі на аснове безнітратных угнаенняў. За вырашэнне гэтай далёка не простай праблемы і ўзяўся наш калектыў. Сёння ў сувязі з так званым дачным бумам агароднікаў-аматараў вельмі цікавіць такое няпростае пытанне, як угнаенні. Гною на грады катастрафічна не хапае, ды і заломліваюць за яго такую цану, што галава ідзе кругам. Мы ж у сябе на прадпрыемстве вырашылі наладзіць вытворчасць біягумусу. Усяго некалькіх пакетаў гэтых высокаканцэнтраваных арганічных угнаенняў хопіць на невялічкі агарод. Плануем так разгарнуць вытворчасць, каб забяспечыць гэтымі ўгнаеннямі патрэбнасць дачнікаў Міншчыны, а ў перспектыве — і ўсёй рэспублікі. Спатрэбілася валюта — і мы стварылі сумеснае з замежнікамі прадпрыемства. На Захадзе вялікі попыт на верхавы, так званы белы торф. Вось і рэалізуем яго там.

— Для торфаздабытчыкаў, як і для ўсёй сельскай гаспадаркі, істотным недахопам з'яўляецца сезоннасць. А як вы вырашаеце гэтую праблему?

— Сумесна з прадпрыемствамі Мінска і Жодзіна арганізавалі вытворчасць тавараў народнага спажывання. Вырабляем розныя запчасткі і дэталі для Беларускага аўтамабільнага завода. Зноў жа па кааперацыі са сталічным прадпрыемствам наладзілі выраб пластмасавай аснасткі для сокавыціскалак. Тут двайная выгада: і даходы вялікія, і з сезоннасцю пакончылі.

А зусім нядаўна ўзяліся за дрэваапрацоўку. Набылі і зманціравалі аўтаматычную лінію па апрацоўцы драўніны. Якасць вырабаў — на парадак вышэйшая, чым у айчынных машын. Такія дошкі з-пад яе выходзяць, быццам адпаліраваныя. Упэўнены, мэбельшчыкі з рукамі адарвуць нашу прадукцыю. А каб заняць на зіму рабочых торфаўчасткаў, наладзілі выраб драўніннай тэхналагічнай дранкі. Словам, праблему беспрацоўя вырашылі. І не толькі на сённяшні дзень, але і на перспектыву.

— А як з сацыяльнымі пытаннямі? Таксама на сённяшні дзень — адна з найбольш вострых задач...

— Паспяхова вырашаецца жыллёвая праблема. Да нядаўняга часу асноўны ўпор рабілі на камунальнае жыллё. У асноўным усе жывуць у шматкватэрных добраўпарадкаваных дамах. Але час мяняецца, мяняюцца і запатрабаванні людзей. Усё большая колькасць работнікаў прадпрыемства хочуць мець індывідуальны дом, прычым з усімі камунальнымі выгодамі. Вось і ідзём насустрач індывідуальным забудоўшчыкам: выдзяляем ссуды, дапамагаем з будаўнічымі матэрыяламі, рабочай сілай. Цэлы пасёлак такіх дамоў вырас за апошнія два-тры гады.

А якія выдатныя ўмовы тут для аздараўлення людзей! Цудоўны бор з яго непаўторным водарам — проста ідэальнае месцейка для будаўніцтва дзіцячай здраўніцы. Але гэта справа павінна вырашацца на ўрадавым узроўні. Мы ж са свайго боку гатовыя аказаць дапамогу і ў будаўніцтве такога санаторыя, і ў яго эксплуатацыі.

— А якімі вам бачацца прадпрыемства і сам пасёлак Зялёны Бор у недалёкім будучым? Скажам так: якімі вы іх уяўляеце ў трэцім тысячагоддзі?

— Мая мара зрабіць наш пасёлак такім, якімі я бачыў падобныя жылыя масівы ў Германіі, Аўстрыі. Гэта — комплекс індывідуальных дамоў-катэджаў з усімі камунальнымі выгодамі, падземным гаражом, саўнай, а то і адкрытым басейнам прама ў двары, садком. Тут жа цэлы комплекс бытавых, гандлёвых і культурных прадпрыемстваў і ўстаноў. Словам, трэба стварыць усе ўмовы, каб людзі жылі сапраўды шчасліва. І гэтыя планы мы пачалі ажыццяўляць ужо сёння.

Пасёлак паміраў паступова і няўхільна, як той безнадзейна хворы чалавек, што ўжо звыкся са сваім лёсам. Калісьці шумныя вуліцы і скверы непрыкметна абязлюдзелі. Паступова скарачалася здабыча торфу. Людзі, для большасці якіх работа на балоце была адзіным сродкам існавання, пачалі шукаць іншыя, больш прыдатныя мясціны. Нават у вялікія святы, калі, бывала, Зялёны Бор аж звініў ад заліхвацкай музыкі, спеваў, стала неяк ціха.

Мяняліся кіраўнікі прадпрыемства, але, здавалася, нішто і ніхто не ў стане ўдыхнуць другое жыццё ў аслаблены арганізм. Не адразу ацанілі зеленаборцы прыход чарговага па ліку дырэктара торфапрадпрыемства Аляксандра Сяргеевіча Касцюкова. «Ні становішча, ні голасу, да таго ж зусім яшчэ маладзеньк , — ківалі галовамі ўмудроныя жыццём старыя. — Ці здолее ён што зрабіць, калі не такія зубры пасавалі перад цяжкасцямі. Пакіруе год—другі, нацешыцца і...»

Толькі нечакана Касцюкоў не толькі ўпрогся сам у справу, але і іншых пачаў прывучаць. Патрэбнасць у паліўным торфе адпала (Жодзінская ЦЭЦ была пераведзена на газ), і тады малады кіраўнік пачаў шукаць іншыя сферы для прымянення торфу. Так узнікла ідэя наладзіць вытворчасць торфагаршчочкаў, потым спецыяльных торфасумесяў для агароднікаў, пастаўляць прасаваны торф на экспарт. Разгарнулася на поўную моц кааперацыя з прадпрыемствамі Жодзіна і нават Мінска. Пачалі будаваць жыллё, комплекс культурна-бытавых прадпрыемстваў... І ажыў, расправіў плечы гарадскі пасёлак, быццам ачнуўся пасля летаргічнага сну — памаладзелым, поўным сіл і энергіі. А талентыў і яго кіраўнік шукаюць новыя сферы для прымянення свайго працоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу...

РЭПАРТАЖ З ЗЕЛЕНАБОРСКАГА ЗАВОДА ПА ПЕРАПРАЦОЎЦЫ ТОРФУ

спецыяльных карэспандэнтаў «Звязды» Уладзіміра ГОЙТАНА і Яўгена ПЯСЕЦКАГА (фота).



Звалка смецця... у зоне адпачынку?

Нямнога ў нас засталося мясцін, дзе чалавек не паспеў бы «наслядзіць». Адзін з такіх прывабных куточкаў — гарадскі пасёлак Зялёны Бор. Удалечыні ад буйных прамысловых цэнтраў, ён змог захаваць сваю непаўторную прыгажосць, еднасць з прыродай. Тут чыстае паветра, няма шкодных вытворчасцей. А якія маляўнічыя краявіды: пасёлак проста патанае ў засені стромкіх соснаў і бяроз!

І вось невядома па чыёй ініцыятыве ў нейкім кіламетры ад жылога масіву было вырашана абсталяваць звалку: прычым звозіць сюды адходы з Жодзіна і Барысава. І месца падабралі адпаведнае —старыя кар'еры. А каб прыдаць гэтай бязглуздзіцы хоць бы нейкую бачнасць законнасці, 6 лістапада мінулага года правялі сумесную нараду прадстаўнікоў Жодзінскага гарвыканкома і Зеленаборскага пасялковага Савета. Марна старшыня Жодзінскага гарвыканкома Л. Печань, галоўны інжынер жыллёва-камунальнай службы В. Башкевіч, віцэ-прэзідэнт асацыяцыі «Камунальнік» Ж. Чачкоўскі імкнуліся пераканаць прысутных у тым, што, маўляў, звалка нікому не прынясе шкоды. І што дзіўна, нават галоўны ўрач Жодзінскай бальніцы, дэпутат Мінскага абласнога Савета Н. Целябук і тая выказалася за абсталяванне звалкі ў раёне пасёлка Зялёны Бор. Толькі каму лепш, чым ахоўнікам здароўя вядома, якія пакуты наканаваны жыхарам пасёлка, што вымушаны жыць у такім суседстве? Гэта і бясконцы смурод, і небяспека інфекцый, асабліва, калі непадалёку ад паверхні знаходзяцца грунтавыя воды. І тым не менш урач чамусьці «не супраць звалкі».

І толькі старшыня Зеленаборскага пасялковага Савета М. Жук, старшыня савета ветэранаў С. Лібаў, намеснік старшыні камісіі па экалогіі Зеленаборскага завода па перапрацоўцы торфу М. Грымовіч катэгарычна выказаліся супраць такога «падарунка». Больш таго, у пісьме Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь яны, а таксама вялікая група жыхароў пасёлка справядліва патрабуюць шукаць іншага месца для звалкі.

І яшчэ вельмі важкі аргумент на карысць гэтай пазіцыі зеленаборцаў. У сувязі з радыяцыйнай небяспекай, якая навалілася на жыхароў рэспублікі, мала засталося прыдатных месцаў для арганізацыі адпачынку, асабліва дзяцей. І адным з такіх куткоў мог бы стаць Зялёны Бор. Тут, здаецца, самім Богам прадугледжана месца для абсталявання дзіцячага санаторыя: цудоўнае паветра, маляўнічыя лясы, ёсць вадаём, неабходны комплекс бытавых прадпрыемстваў. Няўжо некаму лепш будзе мець тут звалку для смецця?

НОВЫЯ ПРАФЕСІІ ТОРФАЗДАБЫТЧЫКАЎ

Ёсць нешта адметнае ў рабоце кожнага майстра. І зусім не важна, што робіць чалавек. Калі ён на сваім месцы, з душой адносіцца да справы, нельга не любавацца ім, па-добраму не зайздросціць.

Вось і тут, дастаткова некалькі хвілін паназіраць за апрацоўшчыцай цэха пластмасавых вырабаў Вольгай Дзем'яновіч, каб зразумець: гэта майстар сваёй справы. Работа ў яе руках гарыць. Мінула ўжо пяць гадоў з таго часу, як маладая работніца асвоіла зусім новую для яе справу—апрацоўку пластмасавых нарыхтовак. Раней працавала на фабрыцы тарфяных гаршкоў. Але вось перад дырэкцыяй прадпрыемства паўстала задача: чым заняць тых людзей, якія не могуць працаваць на перапрацоўцы торфу? Так узнікла ідэя кааперацыі з прадпрыемствамі Жодзіна і Мінска. Для БелАЗа тут наладзілі выраб многіх металічных дэталяў. Дарэчы, у мехцэху № 2 працуе муж Вольгі — Сяргей Дзем'яновіч. А яна перайшла на работу ў пластмасавы цэх. Па дагавору з Беларускім оптыка-механічным аб'яднаннем імя Вавілава тут вырабляюць камплектуючыя пластмасавыя дэталі для корпуса бытавых сокавыціскалак, іншых вырабаў. Падобная кааперацыя — ўзаемавыгадная. Цяпер калектыў торфаперапрацоўчага завода шукае новых партнёраў: ёсць вытворчыя магутнасці, кадры.

Церам для дзятвы

Сярод стромкіх соснаў у цэнтры пасёлка неяк неўпрыкмет вырасла не зусім звычайная пабудова. Рэдкі дарослы не спыніцца, не акіне вокам дзіўныя вежы над рознакаляровымі сценамі цуда-церама. Што тады казаць пра дзяцей! Быццам магнітам цягне іх сюды.

Вось і мы разам з загадчыцай дзіцячага садка Людмілай Рыгораўнай Грымовіч пераступаем парог будынка. Усё навокал зяе той адвечнай навізной, што ўласціва новабудоўлі, якая рыхтуецца прыняць навасельцаў. А яны, прыціхлыя і зачараваныя, разам з выхавальніцай прыйшлі сюды на экскурсію. Хутка садок прыме першых выхаванцаў. А пакуль будаўнікі наводзяць апошні бляск.

Не меншае ўражанне, чым ад вонкавага выгляду, засталося пасля таго, як мы пабывалі ўнутры будынка. Усё зроблена для таго, каб юныя выхаванцы адчулі тут сапраўдны камфорт: светлыя прасторныя спальні, пакоі для заняткаў, гульняў. А яшчэ — плавальны басейн, зала для заняткаў спортам, музычны салон, зімовы сад...

— Садок разлічаны на паўтары сотні выхаванцаў,— гаворыць Людміла Рыгораўна.— У нас пакуль каля 120 дзяцей. Але ў перспектыве яго запоўнім цалкам. Прызнацца, такі садок, як у нас, цяжка знайсці нават у сталіцы. І гэтым мы ў многім абавязаны дырэктару Зеленаборскага завода па перапрацоўцы торфу. Аляксандру Сяргеевічу Касцюкову. Усё новае, што з'яўляецца ў гэтай сферы, абавязкова становіцца набыткам нашага садка. На гэта кіраўнік сродкаў не шкадуе. Мяркуем абсталяваць санаторную групу для дзяцей, здароўе якіх па нейкіх прычынах аслабленае. Плануем адкрыць солевую шахту для інгаляцый, набыта абсталяванне для кіслародных кактэйляў. Словам, спраў і клопатаў цяпер усім хапае.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Аператар машыны для ліцця пластмас Вольга ДЗЕМ'ЯНОВІЧ.
2. Новы дзіцячы садок.
3. Добра працуе змена майстра Уладзіміра ПАУЛАЎЦА.
4. Якасць прадукцыі правярае лабарант Ірына ВАЛЕТКА.
5. Аператар Валянцін ГАЙДУК вырабляе ўпакоўку для яек.
6. За падрастаючымі таматамі даглядае гаспадыня цяпліцы Надзея ГАЙДУК.

ГАРШЧОЧКІ НА КАНВЕЕРЫ

Цэх сустрэў ледзь чутным гулам машын. І толькі дзе-нідзе былі бачны людзі: некалькі аператараў за пультамі кіравання, ды ў канцы даўжэзнага пралёта працаваў пагрузчык. Ён загружаў паддоны з ужо гатовай прадукцыяй — тарфянымі гаршчочкамі.

— Усё правільна, — тлумачыць начальнік цэха Васіль Бондар. — Цэх тарфяных гаршчочкаў спраектаваны так, што большасць працэсаў у ім поўнасцю аўтаматызаваныя. У гэтым немалая заслуга праекціроўшчыкаў дацкай фірмы «Хартман». Дарэчы, аналагаў нашай вытворчасці няма не толькі ў рэспубліцы ці былым Саюзе, але нават і ў свеце.

Васіль Аляксандравіч і сёння, праз шэсць гадоў пасля ўводу ў эксплуатацыю цэха па вытворчасці тарфяных гаршчочкаў, не можа да канца асэнсаваць: як удалося, што называецца, з ліста асіліць такі значны аб'ём работы. Прычым з людзьмі, большасць якіх не толькі ніколі ў вочы не бачылі такога велізарнага комплексу машын і механізмаў, але нават не ўяўлялі пра яго існаванне. Вунь як спрытна завіхаецца механік Уладзімір Ярмоленка. Ён тут ведае кожны вузел, кожную дэталь.

А тады, сем з лішнім гадоў назад, калі ім даверылі манціраваць абсталяванне, гэта быў радавы слесар. Як, між іншым, і астатнія хлопцы брыгады. Узяць тых жа аператараў Івана Казачка, Васіля Шыліка... У той час яны працавалі машыністамі цеплавозаў у транспартным цэху, які ўзначальваў ён, Васіль Бондар. І, вядома, ні пра якія замежныя машыны і механізмы накшталт вось гэтых нават не чулі.

Як, на якім кані пад'ехаў тады да яго былы міністр тарфяной прамысловасці рэспублікі Генрых Аляксеевіч Філіпаў, — і цяпер толкам не ведае. Выклікалі маладога начальніка транспартнага цэха ў кабінет дырэктара прадпрыемства. А там — сам міністр. Пачаў здалёк: як працуецца, як жыццё-быццё, а скончыў тым, што прапанаваў сваімі сіламі змантаваць цэх па вытворчасці тарфяных гаршчочкаў. Прычым, з падтэкстам: маўляў, хіба ў нашых людзей дурнейшыя галовы, чым у замежнікаў, або рукі не з таго канца растуць? Гэта ўжо потым даведаўся: кошт новай лініі дацкай вытворчасці — 1 мільён 250 тысяч рублёў, да таго ж за мантаж яе замежныя спецыялісты запатрабавалі яшчэ чвэрць мільёна. Хутчэй за ўсё ў міністэрстве з валютай тады было туга, вось і прыйшла даспадобы думка манціраваць уласнымі сіламі.

З усяго «інжынернага корпуса» ў групе дыпламаваным спецыялістам быў адзін Васіль Бондар. Астатнія — з бору па сасонцы: слесары ды машыністы цеплавозаў, якім пасля скарачэння транспартнага цэха наогул не было чаго рабіць.

З месяц, пэўна, патраціў на тое, каб сабраць і прывесці да ладу тыя сотні скрынак з абсталяваннем, якімі былі завалены машынны двор і ўся сумежная тэрыторыя. А потым узяліся за мантаж. Толькі тады зразумеў, які неасцярожны крок зрабіў, калі даў згоду манціраваць «уласнымі сіламі».

Чарцяжы, мантажныя схемы разлічаны менавіта на спецыялістаў. І ўсе запісы на англійскай мове. Словам, не радавому савецкаму інжынеру з яго студэнцкімі залікамі па замежнай мове...

Але разабраўся, зразумеў. Вядома, ніхто не браў пад увагу тыя поўныя напружання дні і бяссонныя ночы, калі галава, здавалася, трашчала ад гэтых бясконцых схем і вуэлоў, якія павінны былі размясціцца там, куды ён пакажа.

А яшчэ хацелася даказаць, што не перавяліся ў наш час славутыя «Ляўшы». Асіліць такі аб'ём работы — не блыху падкаваць: тут апрача віртуознага майстэрства яшчэ і інжынерны разлік патрэбен. Словам, калі праз паўтара года на пуск цэха прыехаў вядучы спецыяліст дацкай фірмы Таге Енсан, ён доўга не мог паверыць, што ўвесь гэты комплекс зманціравалі вось гэтыя самыя хлопцы ў зашмальцаваных спяцоўках на чале з зусім яшчэ маладым інжынерам. Таму і наладзіў такі дасканалы кантроль, што, здавалася, бясконцыя праверкі ніколі не завершацца. Пільна правяраў работу механізмаў і на халастым ходу, і пад нагрузкай. Хлопцы не крыўдавалі: ведалі, што замежны спецыяліст перш за ўсё дбае пра рэпутацыю сваёй фірмы. Да таго ж, двайны, трайны кантроль страхаваў ад збояў у будучым. І ўсё ж прынцыповых адхіленняў ад патрабаванняў, якія прад'явіла фірма, яны не дапусцілі. Што і засведчыў акт прыёмкі. А ў верасні 1986 года атрымалі першую партыю тарфяных гаршчочкаў. З таго часу канвеер не спыняецца ні ўдзень, ні ўначы, ні ў будні, ні ў святы— за год цэх выдае каля 150 мільёнаў штук гаршчочкаў.

Попыт на прадукцыю Зеленаборскага завода па перапрацоўцы торфу, у тым ліку і на гаршчочкі, вялікі. Асабліва імкнуцца набыць іх агароднікі. Як сведчаць шматгадовыя назіранні, выкарыстанне тарфяных гаршчочкаў дазваляе атрымаць больш ранні ўраджай агародніны. Да таго ж, у гаршчочках расліны больш моцныя, бо выключаюцца механічныя пашкоджанні і дэфармацыя каранёвай сістэмы пры перасаджванні, што гарантуе хуткую прыжывальнасць, інтэнсіўнае развіццё культур. Порыстасць сценак тарфяных гаршчочкаў садзейнічае аптымальнаму водна-паветранаму рэжыму ў каранёвай зоне, што ў сваю чаргу рэзка павышае ўраджайнасць культур.

Скарб пад назвай «торф»

— Мяне, як чалавека і спецыяліста, абражае, калі даводзіцца чуць, што наша рэспубліка бедная на рэсурсы, што ў нетрах яе амаль няма карысных выкапняў,— гаворыць намеснік начальніка вытворча - эканамічнага аддзела Алена Мікалаеўна Бондар.— Няхай няма залатых ці алмазных капальняў. Але ёсць нешта такое, што можа з поспехам замяніць усё гэта багацце.

Найперш — гэта торф. Далёка не ўсе, я ўпэўнена ў гэтым, ведаюць, што па запасах торфу, асабліва верхняга, так званага белага, Беларусь не мае аналагаў у свеце. Да нядаўняга часу яго запасы вымяраліся сотнямі мільёнаў тон. Але... Як нярэдка бывае, што маем, тое не цэнім. Правялі меліярацыю ўнікальных па запасах радовішчаў. Не хапала паліва — дзесяткі мільёнаў тон каштоўнай сыравіны спалілі ў печах, катлах цеплаэлектрастанцый, бытавых кацельнях. А колькі мінералізавалася, развеялася ветрам! А гэта ж грошы — мільёны, мільярды рублёў.

Што гэта так, няцяжка пераканацца. Вучоныя, эколагі, проста шырокая грамадскасць усё мацней падае свой голас у абарону ўнікальнага тварэння прыроды — балот. Гэта і выдатны рэгулятар вільгаці ў глебе, што ў такія засушлівыя гады, як сёлетні, мае выключнае значэнне. Вялікія перспектывы торфу (пра гэта сведчыць вопыт эксплуатацыі Рудзенскага завода горнага воску) ў атрыманні каштоўнай сыравіны для прамысловасці, медыцыны. Значны эканамічны эфект мае выкарыстанне торфу для вытворчасці гаршкоў.

Сапраўдным залатым дном стаў верхні (белы) торф і для працаўнікоў Зеленаборскага завода па перапрацоўцы торфу. Прычым попыт на гэтую прадукцыю (а разам з ім і кошт яе) увесь час расце. Зацікавіліся белым торфам у Еўропе, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, Кувейце, іншых краінах Блізкага Усходу. Хіба торф не стаў залатым?

Для тых, каго зацікавяць матэрыялы старонкі, нагадаем адрас прадпрыемства: 222218, Смалявіцкі раён, пасёлак Зялёны Бор, Зеленаборскі завод па перапрацоўцы торфу.

РОЗГАЛАС

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ РОЗДУМУ:

ЭКАЛОГІЯ

На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь знаходзіцца 76 ахоўваемых прыродных аб'ектаў, якія займаюць 3,7 працэнта тэрыторыі рэспублікі. У іх ліку—2 запаведнікі, 1 нацыянальны парк, 73 заказнікі рэспубліканскага значэння. Пад ахову ўзята 186 помнікаў прыроды, 299 месц вырастання 68 відаў раслін і 1.079 папуляцый 47 відаў жывёл, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Аднак замест запланаваных рэспубліканскай комплекснай праграмай «Экалогія» трынаццаці заказнікаў пакуль створана толькі пяць, а з-за адсутнасці фінансавых сродкаў не вядзецца падрыхтоўка да стварэння нацыянальнага парка «Белая Русь» і Свіслацка-Бярэзінскага запаведніка.

Ці чакаць нам сваіх Уолтаў Дыснеяў?

У гэтым годзе ў Беларускай акадэміі мастацтваў пачалося навучанне па новых спецыяльнасцях: рэжысёр мультыплікацыйнага фільма, аператар кіно, мастак кіно, тэлеаператар.

Тэлеаператары будуць займацца на базе тэлебачання. Астатнія аддзяленні, гэтак жа як і ўжо існуючыя майстэрні іграванога і дакументальнага кіно, размясціліся на кінастудыі «Беларусьфільм».

Гэта толькі пачатак. І, магчыма, у недалёкім будучым беларусы будуць мець свой кінафакультэт, а яго выпускнікі стануць сапраўднымі майстрамі кіно.

Ганна ЛАГУН.

Адам Акуліч — па адукацыі акцёр драматычнага тэатра. У свой час скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, працаваў у Тэатры юнага гледача і ў акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. У канцы 70-х эмігрыраваў у ЗША, дзе воляю выпадку стаў журналістам. Працуе ў беларускай рэдакцыі «Свабоды». Сёлета ў жніўні Адам Акуліч упершыню пасля ад'езду пабываў на Беларусі.

З НЬЮ-ЙОРКА ЎСЁ БАЧНА ТРОШКУ ІНАКШ...

Карэспандэнт радыёстанцыі «Свабода», наш зямляк Адам АКУЛІЧ, дае інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды» Таццяне АНТОНАВАЙ

— Спадар Адам, колькі дакладна гадоў вы не былі на Бацькаўшчыне?

— Чатырнаццаць.

— Год назад, калі мы гутарылі з вамі ў Нью-Йорку, вы казалі мне, у якім стане пакідалі Беларусь: «Я страціў веру ў справядлівасць, у будучыню, бо сутыкнуўся з адкрытай карупцыяй і мафіяй. Быў перакананы, што перспектывы ніякай наперадзе няма». Якія вашыя ўражанні цяпер, пасля доўгай адсутнасці?

— Вельмі складаныя ўражанні. Калі вымяраць дыяпазонам ад добрага да дрэннага, дык я думаю, што стрэлка будзе схіляцца да адзнакі «дрэннае». Я спадзяваўся і ўяўляў, што справы тут значна лепшыя.

— А ці нельга больш канкрэтна?

— Паспрабую. Я думаю, гэта вельмі нестабільная эканамічная сітуацыя плюс яшчэ палітычная няпэўнасць. Можа, жыхару Мінска ўсё бачыцца інакш. Але маё ўражанне абумоўлена якраз гэтымі паказчыкамі нестабільнасці і няпэўнасці.

— Гэтае вашае ўражанне грунтуецца толькі на асабістых назіраннях і інтуіцыі, альбо яно падмацавана нейкай інфармацыяй?

— Я аб'ездзіў шмат гарадоў Палесся і Брэстчыны. Мяне цікавіла, які радыяцыйны фон у гэтай зоне, як уздзейнічае радыяцыя на здароўе людзей. Зразумела, я сустракаўся з кіраўнікамі гарадскіх і раённых уладаў, старшынямі калгасаў. Былі таксама сустрэчы з дэпутатамі, членамі ўрада, прадстаўнікамі розных партый. Менавіта атрыманая ў выніку гэтых сустрэч інфармацыя, яе аналіз далі мне магчымасць зразумець, наколькі складаныя працэсы адбываюцца ў грамадстве. Я, па праўдзе, так і не змог уявіць агульную карціну. Ацэньваючы сітуацыю ў Беларусі з Нью-Йорка, я меў больш выразнае ўяўленне. Цяпер я яго не маю. Яно і больш жывое, і адначасова больш размытае, няпэўнае.

— 70-я, пачатак 80-х гадоў трактуюцца цяпер як перыяд найбольшага застою, ідэалагічнага прэсінгу. Канешне, тады было цяжка праявіць сябе неардынарнаму чалавеку, а праславіцца «ерэтыком» — даволі лёгка. Як, на ваш погляд, перамены ў грамадскім ладзе паўплывалі на жыццё людзей?

— Мне даволі цяжка рабіць нейкія абагульненні. Думаю, што гадоў 15—20 назад, а можа, я і памыляюся, было больш веры, людзі не былі ў такім абстрактным становішчы, як цяпер. Поўная няпэўнасць, шок, разгубленасць перад цяжкасцямі эканамічнага становішча. Мне здаецца, што мы тады, у 70-я, жылі больш спакойна і паўнакроўна на нешта спадзяваліся, строілі планы. Творчая моладзь наведвала розныя гурткі, дзе вяліся дыскусіі, абмяркоўваліся спектаклі, кнігі. Цяпер такога я не заўважыў. Адбылася парадаксальная духоўная дэградацыя грамадства.

— Ці верыце вы ў Бога?

— Хаця я і лічу сябе атэістам, але думаю, што ў кожнага атэіста ёсць свой Бог. Мой Бог — гэта Бог роўнасці. Усе людзі нарадзіліся аднолькавымі, але чамусьці адзін лепш маецца, а другі — горш. І вось гэтая сацыяльная несправядлівасць мучыць.

— У вас амаль што камуністычныя перакананні...

— Не жартуйце. Камуністычная ідэалогія — гэта тэзісы, маніфесты. Хаця «Камуністычны маніфест» — гэта надзвычайны дакумент. Калі б камуністы, бальшавікі, КПСС думалі пра сацыяльную справядлівасць — карупцыі не было б. На словах было адно, на справе — іншае.

— Ну, з камунізмам у нас, здаецца, ужо ўсё зразумела. З дэмакратыяй вось ёсць праблемы... На жаль, айчынныя дэмакраты любяць карыстацца «бальшавіцкімі метадамі». Як вам гэта падабаецца?

— Не падабаецца зусім, хаця яно зразумела — такая спадчына.

— Ці зменіць нешта гэтая паездка ў падыходзе да журналісцкай працы на «Свабодзе?»

— Так. Візіт дамоў даў мне шмат матэрыялу для арыентацыі. У выніку гэтага мае ранейшыя арыенціры змяняюцца, нярэдка кардынальна мяняюцца погляды на некаторыя з'явы. Жыццё аказалася такім непрадказальным. Я глядзеў Беларускае тэлебачанне, слухаў радыё і пераконваўся, што радыё «Свабода» таксама ёсць што сказаць. Але цяпер нам будзе больш складана працаваць. Калі раней мы маглі нейкі момант жыцця закрануць і мусіраваць яго да дзірак, то цяпер павінна быць больш разнастайная інфармацыя з глыбокім і прафесіянальным аналізам.

— Я ведаю, што амерыканскія журналісты вельмі любяць у сваіх матэрыялах прагназіраваць сітуацыі, нават канструяваць іх. Спрагназіруйце, спадар Адам, наш недалёкі беларускі варыянт развіцця падзей.

— Вы мяне правакуеце. Бо беларускі варыянт увогуле малапрадказальны па самых розных прычынах. Можна меркаваць, напрыклад, што канфлікт магчымы паміж сацыял-дэмакратамі і тымі партыямі, якія абараняюць інтарэсы сярэдняга класа. Я наўмысна не кажу тут пра канфлікт сацыял-дэмакратаў з БНФ, які, мне здаецца, выспявае і можа мець негатыўныя вынікі. Але думаю, што пры жаданні сацыял-дэмакраты змогуць знайсці кампраміс з усімі. На думку прафсаюзаў, нацыянал-дэмакратаў, хрысціянаў, сялянскіх партый, сацыял-дэмакраты — стары апарат. Але наколькі яны маюць рацыю ў гэтым?

— Як вы ставіцеся да таго факта, што, нягледзячы на вялікія перамены ў нашай краіне, на развіццё працэсаў дэмакратызацыі, многія грамадзяне хацелі б эмігрыраваць з Беларусі на Захад? Што вы можаце сказаць ім?

— Па-першае, абсалютна небяспечна раздаваць рэцэпты. Калі мне нехта скажа: гэты чалавек сябе не знойдзе ў эміграцыі, я не перакананы, што гэта так і ёсць. Я, напрыклад, выехаў зусім у іншы час. Колькі разоў за гэтыя шэсць гадоў перабудовы я лавіў сябе на думцы, што ўсё-такі ў нас там вельмі цікава. Цяжка, але цікава. Я нават пашкадаваў, што галоўная падзея прайшла міма. Канешне, я разумею, што збоку, з-за акіяна, глядзець на ўсе падзеі вельмі проста. Але ўсё-такі, па вялікаму рахунку, калі б перада мной стаяла пытанне пра эміграцыю цяпер, то выбар быў бы адназначны — у Беларусі. Я растлумачу чаму. Усё-такі ёсць магчымасць таго, што будзе вольны рынак, гэта не таму, што так хочуць ліберальныя сілы, або амерыканскі прэзідэнт, або капіталісты на Захадзе, якія прагнуць упіхнуць свае капіталы ў былую савецкую эканоміку. І такую магчымасць, шанц я не пакінуў бы нерэалізаваным. Можа я і вялікі аптыміст, але думаю, што за 10—15 гадоў у нас будуць такія ж самыя магчымасці, як у Англіі, Амерыцы. Мы не гаворым тут пра тэхнічную рэвалюцыю. Фактычна гэтыя роўныя магчымасці для кожнага сёння складаюць фундамент амерыканскай дэмакратыі. І я перакананы, што той рэгіён, які называўся да 1985 года «даспелым, разгорнутым сацыялізмам», будзе той самай зонай прадпрымальніцтва, у якой мільёны людзей знойдуць сябе. З'явяцца такія ж самыя незалежныя бізнесмены, як на Захадзе.

Як бы добра ні было ў чужой краіне, усё-такі жаданне чалавека і мара яго — быць на сваёй зямлі. Кажу гэта не таму, што маю настальгію. Думаю, што ў старэйшых людзей гэта больш асэнсавана і нават больш мудра сказана. Да мяне гэта толькі яшчэ пачынае прыходзіць. Цяпер я перакананы, што тут у нас усё можа быць! А раней жа я быў упэўнены, што тут не можа быць нічога.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

А БЕЗ ВАДЫ НІ ТУДЫ І НІ СЮДЫ

31 кастрычніка ў Санкт-Пецярбургу плануецца ўвесці новыя тарыфы на ваду. На мясцовым заводзе штурманскіх прыбораў ужо наладжваецца вытворчасць водных лічыльнікаў, якія будуць устаноўлены ў дамах вясной 1993 года.

КАРАЛЕВА... З ПАЛКОЎНІЦКІМІ ПАГОНАМІ

Нямногія ведаюць, што візіту ў Латвію дацкай каралевы папярэднічала вялікая падрыхтоўка. Цэлы месяц брыгада работнікаў займалася ў Рундальскім палацы зборкай мэблі, лаючы прадукцыю Валмієрскага мэблевага камбіната. За тыдзень перад прыездам аўгусцейшай асобы ў Турайдэ сіламі службы бяспекі Латвіі была праведзена генеральная рэпетыцыя сустрэчы. У ролі каралевы выступіў сам шэф латвійскай бяспекі палкоўнік Ю. Вецтыранс.

МЕТРО ЯК СРОДАК АД БЕСПРАЦОЎЯ

У Чэлябінску пачалі будаваць метро. У перспектыве метрапалітэн дапаможа вырашыць транспартныя праблемы, а пакуль што — праблемы беспрацоўя, бо яго будаўніцтва дасць гораду амаль 15 тысяч рабочых месц.

МІЛЬЁН... АД СТУДЭНТА

Адзін з саратаўскіх студэнтаў вырашыў пакінуць мільён сваім нашчадкам. Ашчадную кніжку, на якую пакладзена ўсяго 5 рублёў пад 9 працэнтаў гадавых, ён адрасаваў у XXII стагоддзе. Паводле яго падлікаў, размер укладу за гэты час павінен перавысіць мільён рублёў.

КРАДЗЕЖ МЕСЯЦА

Крадзяжом месяца прызнана ў Латвійскай Рэспубліцы знікненне латуннай дошкі з шыльдай Вярхоўнага Савета Латвіі. Па гэтаму факту вядзецца следства, а зарплата вартаўнікам паніжана да мінімуму. Кампетэнтныя органы лічаць, што гэта справа рук заходніх калекцыянераў, якія збіраюць латвійскія рэліквіі.

А колькі дзяцей магло б нарадзіцца?

ДРАГІЧЫН. З пачатку года ў мясцовым радзільным доме пачалі сваё жыццё больш як 500 нованароджаных, аднак у той жа час кожная трэцяя цяжарнасць у жанчын раёна была перарвана фізічным шляхам, а агульная колькасць абортаў у 1992 годзе дасягнула двух соцень.



Малюнак А. ПАПОВА.

СКАЖАМ РАЗАМ: «ШТО З «БелАЗам»?»

Чым больш часу адлічвае каляндар другога чэмпіянату рэспублікі па футболу, тым больш праясняецца турнірнае становішча каманд, якія, здаецца, займаюць свае месцы ў табліцы згодна з «купленымі білетамі» яшчэ ў мінулым годзе. Як і чакалася, адзіным лідэрам сталі мінскія дынамаўцы, якія на радасць сваім балельшчыкам перамаглі ў Брэсце аднаклубнікаў з лікам 3:0, хоць першы тайм і закончыўся безвынікова.

Чарговую нічыю на сваім полі зрабіў «КІМ». Праўда, такую гульню можна было б «спісаць» на дрэннае надвор'е, каб не назіралася стопрацэнтнай магчымасці забіць хоць бы адзін гол — пенальці. Але гаспадары пляцоўкі не змаглі рэалізаваць адзінаццаціметровы ўдар. Дарэчы, «віцебская» нічыя стала адзінай у туры. Астатнія гульні закончыліся перамогай каманд, якія выступалі ў родных сценах.

Літаральна ўваскрэсшым у параўнанні з першым чэмпіянатам РБ можна лічыць «Гомсельмаш». У чарговай сустрэчы гамяльчане змаглі адабраць два ачкі ў старадарожскага «Будаўніка». Лік — 1:0. Першую перамогу з розніцай у тры мячы атрымаў «Днепр». Дома ён не пакінуў ніякіх шанцаў «Шахцёру», забіўшы ў вароты салігорцаў чатыры мячы. Госці змаглі толькі адночы паслаць мяч у сетку варот сапернікаў. З буйным лікам атрымаў перамогу дома і «Трактар». Бабруйчане правялі тры мячы маладзечанскаму «Металургу». Ну, а найбольш мячоў было забіта на стадыёне «Дынамо» — 9. Такі вынік гульні сталічнай «Беларусі» з аўтсайдэрам першынства — «БелАЗам».

Гаспадары правялі ў вароты гасцей 8 галоў, а жодзінцы — адзін, ды і той забілі за некалькі хвілін да фінальнага свістка. А як радаваліся! Быццам перамогу атрымалі. Але ж для гэтай каманды, лёс якой цяпер складваецца не на яе карысць, кожны забіты гол—свята. Шкада толькі, што святкавалі белазаўцы ў васьмі гульнях толькі двойчы, так і не набраўшы ніводнага ачка.

Астатнія матчы закончыліся так:

«Хімік» — «Ведрыч» — 2:1.

«Тарпеда» (Мн) — «Абутнік» — 1:0.

Наступны тур адбудзецца ў пятніцу, 11 верасня.

Лідэры першынства прымаюць у сябе дома «Трактар», а іх землякі — «Беларусь» — сустракаюцца ў гасцях з адным з аўтсайдэраў — лідскім «Абутнікам».

ТУРНІРНАЯ ТАБЛІЦА ПАСЛЯ 8-ГА ТУРА

	І	В	Н	П	М	А
«Дынамо» (Мн)	7	5	2	0	21- 5	12
«Хімік»	8	4	3	1	7- 6	11
«Тарпеда» (Мг)	8	3	5	0	8- 2	11
«Беларусь»	7	4	2	1	14- 4	10
«Трактар»	8	3	4	1	8- 2	10
«Дынамо» (Бр)	7	4	1	2	5- 4	9
«КІМ»	5	3	2	0	9- 2	8
«Гомсельмаш»	7	3	2	2	7- 7	8
«Днепр»	8	3	2	3	10-11	8
«Шахцёр»	7	3	1	3	7-10	7
«Ламаматыў»	7	2	3	2	12-11	7
«Металург»	8	2	2	4	11-15	6
«Тарпеда» (Мн)	7	1	4	2	6- 7	6
«Ведрыч»	6	2	1	3	5- 6	5
«Будаўнік»	7	1	1	5	4- 9	3
«Абутнік»	7	0	1	6	2-11	1
«БелАЗ»	8	0	0	8	2-26	0

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ХАКЕЙ-92

СТАРТ НЕ ЎДАЎСЯ

Няўдала пачалі мінскія дынамаўцы свае выступленні ў розыгрышы Кубка Міжнацыянальнай хакейнай лігі ў заходнім дывізіёне. У суботу і нядзелю іх сапернікамі была каманда «Рыгас Старз».

Галоўнай дзеючай асобай у матчах быў ... эстонскі арбітр А. Грачоў — выдаленні сыпаліся адно за адным. Не было, здаецца, ніводнай мінуты ў першым матчы, каб на пляцоўцы гулялі каманды ў поўных саставах: то пяцёра супраць чатырох, а то і трох, то чатыры на чатыры, то чатыры на тры... У самым пачатку сустрэчы мінчанам удалося разыграць двух лішніх і павесці ў ліку: закінуў шайбу І. Матушкін. У другім жа перыядзе рыжанам спачатку ўдалося зраўняць лік, а затым нават выйсці наперад, але дакладны кідок Э. Занкаўца ўсё ж выратаваў мінчанам ачко.

Здавалася, што і ў другім матчы гульня пойдзе па такому ж сцэнарыю — зноў пайшлі выдаленні, найчасцей у беларускай каманды. І калі ў першым перыядзе дынамаўцы яшчэ вытрымалі націск, то ў другім тройка гаспадароў, якая засталася на пляцоўцы, не выстаяла супраць поўнага саставу «рыжскіх зорак», а праз некалькі хвілін за варотамі мінчан зноў запалілася чырвонае святло —0:2. Толькі пасля гэтага маладому нападаючаму мінчан С. Стасю ўдалося скараціць лік, але ненадоўга — яшчэ дзве шайбы ў вароты «Дынамо» — 1:4.

Губляць тры ачкі на сваёй пляцоўцы — гэта занадта...

А маскоўскія каментатары ўпарта называюць турнір Міжнацыянальнай лігі чэмпіянатам Расіі...

Выпуск «Розгаласа» падрыхтавалі: Уладзімір Здановіч, Аляксандр Коктыш, Анатоль Сланеўскі, Станіслаў Сулкоўскі.

Павел ГЛОБА:

СТАЛІЦА БЕЛАРУСІ ПЕРАЕДЗЕ Ў ВІЦЕБСК

4 верасня ў выставачным комплексе «На ростанях» была арганізавана прэс-канферэнцыя Паўла Глобы. Астролаг расказаў аб сваёй рабоце над картай Беларусі, што будзе надрукавана ў кастрычніку. У гэтым яму дапамагалі выпускнікі Мінскай астралагічнай школы, на аснове якой у хуткім часе Павел Глоба мае намер стварыць клуб. Мы прапануем чытачам «Звязды» пазнаёміцца з поглядамі вучонага на далейшы лёс беларускай зямлі.

ХОЧАЦЕ-ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ-ПРАВЕРЦЕ

— Астралагічныя карты існуюць у Маскве, Адэсе, Кіеве. Складаючы іх, выходзілі з таго, што ў аснове любога старажытнага горада ляжыць касмічны код. Кожны дом, населены пункт будаваўся па пэўнаму прынцыпу. Нашы продкі, славяне, шмат ад гэтага перанялі. Існуе метад, па якім можна рэканструяваць пачатковы прынцып забудовы горада. Адпраўны пункт для складання карты — гэта размяшчэнне горада, унікальныя асаблівасці яго ландшафту, яго забудовы на працягу стагоддзяў. Карта Мінска выклікана неабходнасцю скаардынаваць дзейнасць людзей у ім. З яе дапамогай любы чалавек, ведаючы свой гараскоп, зможа вызначыць, чым для яго з'яўляецца месца жыхарства: пазітыўнае яно ці, наадварот, адмоўнае.

У Мінску, наблізіўшыся да яго гістарычных каранёў, можна ўзнавіць нейкія даты, запоўніць прабелы. Тут патрэбен не толькі астралагічны аналіз, але і пацвярджэнне дакументаў, а таксама археалагічныя знаходкі. На мой погляд, крыху на ўсход і на паўднёвы ўсход ад горада хутка будзе адкрыта найстаражытнейшая цывілізацыя. Мяркуючы па ўсім, раней існавалі два гарады, на якіх і стаіць Мінск. Яны адносяцца да даскіфскага перыяду, недзе VIII, IX ст. да н. э. (ранні зараастрызм). Праз два гады ў Мінску чакаецца культурны пераварот. Усплывуць архіўныя матэрыялы, будуць новыя археалагічныя знаходкі. Менавіта тады ў Беларусі ўзнікне фундамент для рэнесансу XX стагоддзя, яна і стане цэнтрам адраджэння славянскай культуры. Гэтаму будзе садзейнічаць спалучэнне ў 1993, 1994 годзе Урана і Нептуна, мінулага і будучыні, Вадалея ў знаку Казярога. З апошнім звязана ўся тэрыторыя беларускага этнасу. Але чаму значныя змены адбудуцца ў Беларусі, а не ў Кіргізіі, Эстоніі, якія таксама пад Казярогам? Справа ў тым, што беларускі этнас — этнас арыйскі, славянскі. У далейшым яго прывязанасць да тэрыторыі будзе ўмоўнай, прынамсі ў эпоху Вадалея.

Новая забудова Мінска змяніла яго структуру. Раней ён быў пад знакам Дзевы, сёння — пад знакам Блізнят. Сістэма двайнога знака ўзнікла ў выніку разбурэння і перабудовы гістарычнага культурнага цэнтра. Горад згубіў першапачатковую стройнасць і цэласнасць. Дапушчальна, што Мінск будзе перафарміроўвацца некалькі разоў. Гэта тая міна запаволенага дзеяння, якая спрацуе ў самай непажаданай форме. І менавіта Мінск згубіць свой статус як сталіца. Адсюль і магчымасць перанясення адміністрацыйнага цэнтра ў Віцебск.

Трэба хутчэй вырашаць узнікшыя праблемы з кіраваннем, бо Гродзенская і Брэсцкая вобласці могуць аддзяліцца. Урад у Беларусі пакуль што застанецца той жа, хоць двойчы будзе весціся сур'ёзная размова аб яго замене. Гэта будзе зроблена толькі праз два гады. Але трэба мець на ўвазе, што Дом урада размешчаны ў неспрыяльным месцы. Ён знаходзіцца пад знакам Шаляў. І таму ўсе пачынанні, якія вядуцца адтуль, не адпавядаюць настроям народа рэспублікі, што знаходзіцца пад Казярогам. Праўда, плошча Незалежнасці — гэта плошча Дзевы і дэмакратычных рэформ.

Ганна ЛАГУН.

Зварот беларускіх спартсменаў-алімпійцаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

праграмы развіцця фізічнай культуры і спорту ў Беларусі на 1986—1990 гг.», развальваецца: скарачаюцца дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, закрываюцца падлеткавыя клубы, школы здароўя, спартыўныя секцыі; перапрафілююцца спартыўныя будынкі, з прычыны адмовы большасці калгасаў і саўгасаў і іншых прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу выплачваць юрыдычныя членскія ўзносы згорнута работа 52 сельскіх раённых саветаў ДФСТ прафсаюзаў; у 600 буйных працоўных калектывах ліквідаваны пасады фізкультурных арганізатараў; звольнены больш за 300 трэнераў-выкладчыкаў. Фізкультурныя і спартыўныя работнікі вымушаны ісці ў працяглы адпачынак без утрымання. Калі не будзе фінансавай дапамогі спартыўным установам, то многія з іх, асабліва ў сістэме прафсаюзаў, ужо ў бліжэйшы час зробяцца банкрутамі.

На наш погляд, фізкультурна-аздараўленчая галіна неапраўдана пераводзіцца на камерцыйную аснову, а гэта ўжо сёння дрэнна адбіваецца на школьніках, студэнтах, інвалідах, пенсіянерах, мнагадзетных і малазабяспечаных сем'ях. Можна не весці гаворку аб нацыянальным адраджэнні, калі перакрываецца доступ людзям да культуры, адукацыі, фізкультуры.

Таму настойліва просім вас разгледзець і станоўча вырашыць наступныя пытанні:

— забяспечыць цэнтралізаванае гарантаванае фінансаванне для работы ўсіх спартыўных школ незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці;

— аказаць фінансавую дапамогу ў выглядзе датацыі на ўтрыманне і аснашчэнне спарткомплексаў, асабліва спартбаз і спортзбудаванняў алімпійскай падрыхтоўкі;

— ураўняць спортзбудаванні дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ са школьнымі і дашкольнымі ўстановамі і прымяняць да іх ільготныя тарыфы на энергазабеспячэнне, водазабеспячэнне і іншыя паслугі;

— вызваліць або прымяняць ільготнае падаткаабкладанне (на прыбытак, дабаўлены кошт, надзвычайны падатак, нерухомасць і інш.) асігнаванняў прадпрыемстваў, спонсараў і іншых арганізацый, якія накіроўваюцца на алімпійскую падрыхтоўку, на масавую аздараўленчую работу;

— дазволіць выкарыстанне на алімпійскую падрыхтоўку валютных сродкаў, якія замарожаны Знешэканомбанкам Рэспублікі Беларусь на рахунках спартыўных арганізацый;

— зацвердзіць чатырохгадовую — 1992—1996 г. г. — комплексную праграму масавага развіцця спорту і фізкультуры, прадугледзеўшы ў ёй даўгачасную дзейнасць фізкультурна-спартыўных, дзяржаўных, гаспадарчых і іншых арганізацый па захаванню і расшырэнню спартыўнай базы, выхаванню фізкультурных кадраў, развіццю дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, спартыўных клубаў і іншых падраздзяленняў, па далучэнню дзяцей і ўсяго насельніцтва да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам.

Выказаныя пытанні маглі б знайсці адлюстраванне ў Законе аб фізічнай культуры і спорце, праект якога знаходзіцца ў Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Спадзяёмся, што наша глыбокая заклапочанасць гэтымі праблемамі знойдзе водгук і ў вас.

З глыбокай павагай шасцікратны алімпійскі чэмпіён В. ШЧЭРБА.
Двухкратны алімпійскі чэмпіён А. КУРЛОВІЧ
і іншыя, усяго 39 подпісаў.

Ламбард як люстэрка нашага тленнага жыцця

РЫНАК, КАМІСІЁНКА? ЛАМБАРД!

Раз, два, тры, чатыры. Чатыры рублі. У кішэні дробязь. А да атрымання авансу 10 дзён. Сумнавата. Людзі, зразумела, у якіх можна пазычыць рублёў гэтак ...цацаць, знойдуцца. Толькі такое выйсце з фінансавага крызісу ўжо надакучыла (і самому, і тым, да каго лезеш у грашовыя засекі). Што ж, выйсце можна знайсці з любога становішча, асабліва калі выкарыстаць усё, што ёсць пад рукою. Халадзільнік, тэлевізар, магнітафон, залаты пярсцёнак, іншыя дробязі з золата. Шкада. Так, зусім забыўся. У шафе вісіць амаль што новае паліто на чатыры размеры большае, чым трэба. За паліто — і на рынак або ў камісіёнку. Стоп. На рынак ісці сорамна. У камісіёнку рэч несці нявыгадна, толькі адзін чорт ведае, калі яго прададуць і ці ўвогуле купяць.

Рытарычнае пытанне: «Што рабіць?» Знаёмыя падказваюць, што трэба ўзяць пазыку пад залог маёмасці ў ламбардзе. Паліто ў сумку — і туды.

ЛАМБАРД ПА-МІНСКУ

Пакуль ехаў да ламбарда, што размясціўся на стадыёне «Дынамо», каля 25 сектара, успамінаў, што ведаю пра яго. Памяць узнаўляла з замежнай літаратуры — з жыцця заходніх ламбардаў. Ламбард з камп'ютэрнымі сістэмамі, аўтаматычнымі лініямі, па якіх падаюць рэчы на склад. Ніякіх чэргаў, славутыя амерыканскія ўсмешкі на тварах супрацоўнікаў. Цьфу ты, не да часу ўспомніў, што робіцца ў дзяржаўных ламбардах Масквы. Чэргі на гадзіны, заклапочаныя людзі, карацей кажучы — марока.

Ламбарда амерыканскага, нават маскоўскага я не ўбачыў. Адзін толькі Бог ведае, да якога тыпу аднесці ламбард на стадыёне «Дынамо». Памяшканне пяць метраў на тры або чатыры поўнасцю адмятае ўяўленне ад заходняй прыхільнасці да раскошы. У будынку — шаром пакаці: ні народу, ні рэчаў. Толькі скрашваюць усю гэту пустэчу дзве прыгожыя дзяўчыны, якія прымаюць рэчы. Праўда, не хапае дзяўчатам добрага настрою. Яно і зразумела: хіба не засмуеш, калі сядзіш без справы? Як растлумачыў мне дырэктар гэтага ламбарда, яны толькі-толькі пачынаюць раскручвацца. Яшчэ і месяца няма пасля адкрыцця. Нават працэнты за пазыку не да канца прапрацаваны.

На шчасце, у Мінску акрамя наваспечанага ламбарда на стадыёне, ёсць яшчэ і кампанія «Радзівіл». У адзін з такіх ламбардаў я і накіраваўся.

Каля магазіна «Алеся» разам з інтэлігентнай на выгляд жанчынай мы ў пошуках ламбарда праблукалі хвілін дзесяць. Нарэшце ў дварах заўважылі дзверы з надпісам «Пункт прыёму рэчаў». Інтуіцыя падказала, што менавіта гэта і ёсць ламбард. У памяшканні — ніякіх прылаўкаў, загародак, толькі сталы. Ля аднаго жанчына пералічвае грошы, за другім — піша, за трэцім — робіць на калькулятары нейкія падлікі. Два кліенты, якіх, на маіх вачах разлічылі хвілін за дзесяць, задаволеныя, з грашамі рэціраваліся. Хто ведае, калі падыдуць наступныя: кліентамі пакуль што беларускія ламбарды не разбалаваны. Ці то не ведаюць пра іх існаванне, ці ёсць нейкія сумненні?

ШТО ПРЫМАЮЦЬ ЛАМБАРДЫ

Прымаюць рэчы, якія карыстаюцца попытам. Натуральна, лепш здаваць новае: ацэначны кошт будзе большым. У ламбард прымаюць усё, што носіцца (пачынаючы з шапкі і канчаючы гадзіннікам). Дарэчы, калі ацэначны кошт рэчы меншы за 1.000 рублёў, у ламбард лепш не ісці — не возьмуць. Тэхнічна складаныя тавары прымаюць толькі новыя або калі тэрмін гарантыі яшчэ не мінуў. Што датычыцца каштоўных металаў, то і іх не ўсе ламбарды ў вас прымуць. Напрыклад, толькі два ламбарды кампаніі «Радзівіл» бяруць вырабы з золата. Гэта тыя, што размешчаны ў магазінах «Звязда» і «Падарункі». А вось халодную і агнястрэльную зброю, узнагароды ў ламбардзе не збудзеш. І яшчэ трэба сказаць, што ў ламбардзе не толькі выдаецца пазыка пад залог маёмасці, але маёмасць прымаецца і на захоўванне, а таксама скупляецца.

Працуюць тут людзі з вышэйшай адукацыяй і ў асноўным тыя, хто не адзін год займаецца гандлем. Так што вызначыць кошт рэчы ім не складана.

Ацэньваюць рэчы, выходзячы з таго, што павінна быць гарантыя бясстратнай работы ламбарда: калі па нейкай прычыне, напрыклад, тэлевізар не выкупяць, то кампанія павінна будзе яго рэалізаваць па цане не ніжэйшай за ацэначную. Кліент у ламбардзе атрымлівае 85 працэнтаў ад ацэначнага кошту. З гэтых 85 працэнтаў забіраецца працэнт за карыстанне грашамі. За месяц набягае 7 працэнтаў, за два — 15, за 3—25, незалежна ад выдаваемай пазыкі. Скажам, пуховую куртку таваразнаўца ацаніў у 8.000 рублёў. Размер пазыкі ў гэтым выпадку складзе 6.800 рублёў за вылікам 476 рублёў (7 працэнтаў) за карыстанне пазыкай. Гэта значыць, што на рукі ўладальнік пухавіка атрымае чыстымі 6.324. Выгадна? Канешне, калі улічыць, што ў выніку ўдалай фінансавай аперацыі, або пасля зарплаты, нарэшце, куртку можна забраць (вярнуўшы 6.800 рублёў).

ХТО НЯСЕ

У кліентуры ламбарда пераважае інтэлігенцыя, рабочых мяню, а пенсіянеры тут і наогул рэдкія госці. Карацей кажучы, зараз ламбарды наведвае самы бедны клас — тыя, хто атрымлівае зарплату з дзяржбюджэту. Праўда, ідуць і бізнесмены, якім патрэбны наяўныя грошы.

— Чаму я іду ў ламбард? — перапытвае малады мужчына, а потым рэжа праўду-матку. — Таму што рабочы сёння атрымлівае больш васьмі кускоў, а я — інжынер (слоў было шмат — і сушыць мазгі, і інстытут, і ўрад...) — сяк-так набіраю тысячы тры. Што, будзеце мяне аспрэчваць або яшчэ задаваць пытанні?

КАМЕРЦЫЙНАЯ ТАЙНА

Адносна пытанняў наконт аб'ёму рэалізацыі ламбарда ў месяц, сумы закладаў у дзень, грашовага абарачэння адказаў тут не знойдзеш. Канкурэнцыя! Рынак! Затое пасля такіх правакацыйных пытанняў атрымаеш прыемную ўсмешку: у ламбардаў палітыка гібкая. Называць шпіёнам і лаяцца з вамі не будуць. З-за розных дробязей настрой патэнцыяльным кліентам не псуюць.

ЛАМБАРД ГАРАНТУЕ,

што з рэчамі, якія ў тэрмін не будуць выкуплены, прыйдзецца вам развітацца. На працягу трох дзён пасля заканчэння тэрміну закладу работнікі ламбарда абавязаны рэалізаваць тавар. Ёсць і адно «але»: калі рэч не рэалізавана (што можа здарыцца), «горакліент» мае магчымасць яе выкупіць на правах любога пакупніка, толькі па ацэначнаму кошту.

Дададзім, што рэчы з ламбардаў не прападаюць і не псуюцца (харчовых тавараў ламбард не прымае).

ПАСТСКРЫПТУМ. Адзін з найбольш моцных козыраў ламбарда — яго параўнальна невысокія працэнты і гатоўнасць адразу ж за рэч прапанаваць наяўныя грошы. А што можа быць лепшым у наш час датацый і павышэння цэн? Людзі, каб звесці канцы з канцамі, гатовы не тое што закласці нейкую там рэч, але душу д'яблу прадаць. На жаль, тыя падачкі, якія мы атрымліваем ад дзяржавы ў выглядзе кампенсацый, зусім не гарантуюць матэрыяльнага дабрабыту. Наадварот, людзі губляюць веру ў справядлівасць таго, што адбываецца. Хто ведае, можа якраз ламбарды змогуць нейкім чынам унесці папраўкі ў бюджэты некаторых сваіх кліентаў. Не стала б толькі ўсё жыццё суцэльным ламбардам.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

М. ГАРБАЧОЎ: „МАРАЛЬНАЯ ПЕРАМОГА ЗАСТАЛАСЯ ЗА МНОЙ"

(Працяг. Пачатак у №№ 177, 179, 180).

Канешне, ідэя радыкальнай перабудовы прыйшла не адразу, не раптам. У час аднаго з апошніх снежаньскіх інтэрв'ю (амерыканскай тэлекампаніі 18 снежня) зайшла размова аб тым, з чаго ўсё пачалося. Мне нагадалі, што я неяк сказаў: «Ёсць рэчы, пра якія я не хачу, не магу гаварыць». Ці не наспеў час усё сказаць? Але я зусім не хацеў наводзіць нейкі туман, напускаць на сябе загадкавасць. Проста патрэбен час, каб яшчэ многае абдумаць, паразважаць.

Нам, палітыкам, не хапае часу для таго, каб грунтоўна вярнуцца да вытокаў працэсаў і карэнёў тых ці іншых з'яў. І акрамя таго, канешне, я маю больш поўныя і канкрэтныя ўяўленні, чым хто-небудзь, пра тое, як ішлі справы ў Палітбюро, якія былі працэсы ў партыі, у дзяржаве. Ёсць што прыгадаць, ёсць аб чым паразважаць. Не хачу сказаць, што тут нешта такое надзвычайнае.

Але вось адна фраза, якая можа праліць святло на многае. Мы гулялі па беразе Чорнага мора з Шэварднадзе. Гэта быў семдзесят дзевяты год. Тады мне было сорак восем, а яму пяцьдзесят, напэўна. Наогул, ужо сталыя людзі, што казаць. І ў нас ішла размова аб тым, з чым мы сустракаемся. Мы адчувалі, як у існуючай сістэме цяжка працаваць чалавеку сумленнаму, маральнаму. Эдуард Амвросіевіч сказаў тады: вы ведаеце, усё прагніло. Я з ім быў згодзен.

Палітыкі — няшчасныя людзі ў тым сэнсе, што калі ўжо яны трапілі ў рэфарматарскі працэс, дык, наогул, часта спазняюцца, ім не хапае часу для прыняцця рашэнняў, а ўжо тым больш для даследавання і абдумвання... Тут тоіцца небяспека — занадта даверыцца інтуіцыі, што часта і здараецца...

Пакаленне «шасцідзесятнікаў» доўгі час жыло верай у тое, што трэба толькі палепшыць існуючую сістэму і што гэта магчыма. Калі прыйшоў да заключэння, што яе нельга палепшыць, што патрэбна іншая сістэма? Не магу назваць дакладную дату. Бо асэнсаванне рэальнасці было не нейкім раптоўным азарэннем. Тое, што мы пачалі рэфармаваць у восемдзесят пятым годзе, гэта такі феномен, з якім не сустракаўся ніводзін рэфарматар за ўсю гісторыю чалавецтва.

Але справа не толькі ў гэтым. Гэта быў таталітарны рэжым, прычым у адрозненне ад іншых падобных рэжымаў ён грунтаваўся на татальным панаванні над уласнасцю. І абапіраўся на такую магутную машыну, якой з'яўлялася КПСС з яе манаполіяй на ўсё. Так што гэта быў цвёрды арэшак. І гэта трэба было зразумець нам, каб рэалістычна глядзець на рэформы, пра якія мы думалі.

Ёсць рэчы, якія ўклаліся ў першы этап. Гэта фарміраванне канцэпцыі. Потым пайшоў этап ператварэння канцэпцыі ў палітыку. Нарэшце, пайшла трансфармацыя гэтай палітыкі ў рэальныя формы жыцця. Кожны этап патрабаваў свайго часу, умоў і асваення, асэнсавання вопыту.

У восемдзесят пятым годзе ў мяне яшчэ была ўпэўненасць, што сістэму можна палепшыць. На пэўным этапе прыйшоў да глыбокага перакананння, што мы маем справу з сістэмным крызісам. І што рэформы не пойдуць, калі не дэманціраваць увесь рэжым, усю сістэму. Думаю, прыйсці да такіх высноў дапамагло і тое, што ў сваіх тэарэтычных пошуках разам са сваімі калегамі я ўсё больш вызваляўся ад догмаў, стэрэатыпаў, скаванасці, якія душылі нашу свядомасць, інтэлектуальную работу. Ды мы проста шмат чаго не ведалі пра сваё грамадства. Мы не атрымлівалі неабходнай інфармацыі ні аб сабе, ні аб свеце. Калі ж сітуацыя змянілася і мы ўбачылі, у якім становішчы яно апынулася, наш аналіз прывёў да вываду, што, наогул, мы маем справу з авантурыстычнай мадэллю сацыялізму. Гэта, па сутнасці, быў не сацыялізм, а утапічная, антыдэмакратычная, антынародная, г. зн., па сутнасці, і антысацыялістычная сістэма.

***

Ягор Уладзіміравіч Якаўлеў, які прысутнічаў на гэтай размове з амерыканскімі тэлежурналістамі, убачыў у маёй пазіцыі супярэчнасць: маўляў, у восемдзесят пятым годзе Міхаіл Сяргеевіч бачыў у партыі матор, рухавік рэформ, але калі XXVIII з'езд паказаў, што большасць партыйнай наменклатуры супраць перабудовы, ён не захацеў пакінуць партыю, як зрабілі ў той час іншыя.

Я запярэчыў: у сваім аналізе ён не вельмі дыялектычны. Калі ты задумаў нешта змяніць, рэфармаваць, а тым больш ажыццявіць глабальную рэформу ў гэтай краіне, дык ты нічога не мог бы зрабіць, каб гэта не захапіла саму партыю, калі там не выкрышталізоўваліся сілы, якія змогуць на сябе ўзяць адказнасць, пайсці на рызыку. Прама скажу — было рызыкоўна ў той час у гэтай партыі пайсці такім шляхам. Ідэя матора ідзе адсюль. Трэба было знайсці сілы... Для таго каб працэс пайшоў, патрэбен каталізатар ці, як яшчэ гаварыць, брадзіла, трэба было кінуць у грамадства, якое пачало ўжо хваляваць, у палітычны працэс, што забрадзіў, дрожджы самой партыі. Менавіта рэфарматарскія дрожджы. Гэта было зроблена.

Цяпер пра XXVIII з'езд. Логіка такая, што ўсялякія рэформы ў рэшце рэшт закранаюць карэнныя інтарэсы ўсіх слаёў. Адны набываюць, другія губляюць — гэта абавязкова. Дэмакратычны працэс быццам бы расстаўляе кропкі над «і», ацэньвае, хто ёсць хто. А ці ж многія былі гатовы да таго, каб ім даваў ацэнку ў ходзе дэмакратычных працэсаў сам народ?

Яны прывыклі ў наменклатурным коле круціцца і атрымліваць пасады, узнімацца з году ў год па службовай лесвіцы.

Адбылося сутыкненне. Дэмакратычны працэс сутыкнуўся з аўтарытарным рэжымам, які знізу даверху трымаўся на партыі.

І, ведаючы сілу партыі, я зразумеў: калі мне пакінуць пасаду Генсека, дык рэакцыянеры перамогуць. Ды і нельга было партыю кідаць, бо ў партыі зарадзіўся гэты працэс і ў партыі было шмат людзей, якія прынялі рэформы. Трэба было крыж несці. Нават тады, калі ўжо было не пад сілу.

Дарэчы, падобнае пытанне ў вострай форме было пастаўлена ў гутарцы прадстаўнікамі «Комсомольской правды»: «Вы падманвалі ці Вы падманваліся?»

Што ж, сказаў я, назавём рэчы сваімі імёнамі. Я ведаў, што задуманыя рэформы закрануць многіх. Я ведаў, што давядзецца многім ахвяраваць і часта мяняць тактыку, каб змяніліся краіна, народ і каб ім не перашкодзілі на першым жа этапе.

Як паводзіць сябе? Атакам і націскам падвяргаўся я каласальным. Трэба было на нешта рашацца. Пайсці на рашучую бітву — здаецца, нармальна. Але няма яшчэ падтрымкі народа, яшчэ грамадства не гатова. Таму, выклікаючы самыя жорсткія папрокі, было вырашана аднавіць самыя ўплывовыя структуры. Вы ўспомніце абноўлены ЦК, абнаўленне яго Сакратарыята. Тройчы абнавіліся абкомы, сакратары. А потым — свабодныя выбары. Яны пры ўсіх іх выдатках узнялі народ. І я прыкладаў усе намаганні, каб ніхто не мог спыніць краіну, якая рушыла наперад. Што, думаеце, я не ведаў, які ўдар будзе з боку кансерватыўных колаў партыі, што аб'ядналіся і ў ВПК? Ведаў і трымаў іх побач. Можа, гэтым многае і тлумачыцца. Як гавораць, ішла работа «ў стане». Між іншым, тут і тлумачэнне, чаму я не развітаўся з пасадай Генсека, якая, наогул, мяне за горла трымала. Хоць гэта і было прадметам шалёных нападкаў як унутры партыі, так і з боку дэмакратычных рухаў...

Карацей кажучы, гэта быў дыялектычны, вельмі складаны, пакутлівы працэс, і праз яго я павінен быў прайсці.

Самымі сур'ёзнымі памылкамі лічу наступныя: трэба было выкарыстаць стабільнасць і падтрымку народа на першым этапе перабудовы, каб хутчэй рухацца да рыначнай эканомікі. Другі пралік: перагаворы аб падпісанні новага Саюзнага дагавора трэба было пачаць на некалькі месяцаў раней. Але для гэтага неабходна была згода ўсіх дэмакратычных сіл, а яны працягвалі змагацца адна з адной, аслабляючы сябе перад кансерватарамі. Таму я быў не да канца свабодны ў выбары рашэнняў і ўпусціў час. І яшчэ: трэба было не толькі хутчэй разбурыць старую таталітарную сістэму, але таксама хутка будаваць новую сістэму. Але ўсё гэта не закранае майго фундаментальнага выбару, які адстойваю, а менавіта — што я распачаў рэформы ў 1985 годзе. Але цяпер падумаў: адбывалася гэта ўсё ж таму, што ні цэнтры перабудовы, ні тым больш грамадства не былі гатовы псіхалагічна.

Краіна ў пачатку перабудовы знаходзілася ў жудасных умовах. Адзінае, што яшчэ функцыяніравала і захоўвала канкурэнтаздольнасць,— гэта ваенны сектар. Трэба было мадэрнізаваць усё. У 1987 годзе мы пачалі ажыццяўленне праграмы рэфармавання ўсёй эканамічнай сістэмы і тады ўбачылі, хто перашкаджае пераменам: партыя і кіруючыя звенні эканамічнай структуры. Пачалася самая цяжкая з усіх бітваў, бітва, у якой кульмінацыйным пунктам былі жнівеньскі путч і пакутлівы распад Савецкага Саюза.

ЯШЧЭ ПРА ЖНІВЕНЬСКІ ПУТЧ І ЯГО ВЫНІКІ

Пра падзеі таго часу, пра тое, што давялося перажыць, я ўжо расказаў у сваёй папярэдняй кнізе. Але тэма гэтая хвалюе і сёння. Як магло адбыцца падобнае? Чаму гэтыя людзі аказаліся на ключавых пасадах у дзяржаве? Ці былі сімптомы падрыхтоўкі путчу? Ад журналіста Ю. Шчакачыхіна я пачуў і такія дэталі, пра якія не ведаў. Прыведу гэтую частку гутаркі з ім па магчымасці больш поўна.

— Ці даходзіла да Вас праўдзівая інфармацыя пра тое, што адбываецца ў краіне? — спытаў субяседнік.

— Даходзіла і інфармацыя, і, на жаль, дэзінфармацыя на працягу апошняга года — хацелі падвесці мяне да ўвядзення надзвычайных мер. Не толькі мэтанакіравана падбіралася тэндэнцыйная інфармацыя, але нават падзеі арганізоўваліся так, каб потым на іх падставе гэтую дэзу стварыць.

— Гэта значыцца як? — спытаў ён.

— А так: выехаць куды-небудзь па даручэнню ЦК Кампартыі Расіі; арганізаваць — дзе сустрэчу з партыйнымі сакратарамі, а дзе ўдасца — з радавымі камуністамі (праўда, гэта горш удавалася — лягчэй з сакратарамі), і потым рэзалюцыя з пратэстам, з патрабаваннямі да мяне. Ультыматыўныя патрабаванні! А я адчуваў, што гэтыя рэзалюцыі напісаны ў Маскве, да выезду на месца.

— А ці ведаеце, што на мітынгі ў Літву — для масавасці! — прывозілі цэлыя аўтобусы «мітынгуючых» з Беларусі?

— Гэтага я не ведаў. Дарэчы, патрабаванні адтуль, з Літвы, яшчэ да студзеньскіх падзей ішлі вельмі жорсткія. І не толькі з партыйных структур. Рэальныя цяжкасці — тая ж занепакоенасць адстаўных ці дзеючых афіцэраў — перапляталіся з тымі, што нараджаліся ў кабінетах на Старой плошчы. Патрабаванні ішлі даволі жорсткія — увесці прэзідэнцкае праўленне...

— Міхаіл Сяргеевіч, — сказаў Шчакачыхін,— а для мяне і цяпер сёе-тое застаецца загадкай. Я апублікаваў 10 ліпеня артыкул «Літоўская карта» — пра злавесную ролю КДБ, якую ён адыграў у час студзеньскіх падзей у Вільнюсе, і ў той жа дзень, дзесятага, накіраваў Вам пісьмо... Ці дайшло яно да Вас?

— Аб чым?

(Заканчэнне будзе).

SOCIETA ITALIANA CERCA RESPONSABILE VENDITE SETTORE COSMETICI, ALIMENTARI, ALCOLICI E PRODOTTI FARMACEUTICI. RICHIESTA ESPERIENZA SETTORE, DINAMICITA, ETA MAX 35, CONOSCENZA ITALIANO O INGLESE, MEZZO TRASPORTO PROPRIO, PAGA ADEGUATA E PERCENTUALI SULLE VENDITE, TELEFONO CONTATTO: 64-32-00.

САДЖАЕМ АГРЭСТ І ПАРЭЧКІ

Гэтыя культуры звычайна лепш прыжываюцца восенню. Хоць і веснавая пасадка таксама не выключаецца. Толькі яе праводзяць як найраней, калі кусцікі «спяць».

Асенняя работа больш спрыяльная для гэтых культур. За верасень—снежань глеба добра ўціснецца, карані атрымаюць апору. Рост звычайна шпаркі і моцны.

Пасадкі звычайна робяць па краях участка. Пустазелле ліквідуюць вельмі старанна. Асабліва карэнішчы шматгадовых «піратаў» — пырніку, дзьмухаўцу, асоту, конскага шчаўя, крапівы. Глебу вапнуюць, памятаючы, што найлепшая яе рэакцыя — слабакіслая ці набліжаная да нейтральнай.

У ямкі-кубікі памерам 40×40×40 см уносяць кампост ці перапрэлы гной (вядро), попел (паўшклянкі), суперфасфат і сернакіслы калій (па дватры запалжавыя карабкі). Угнаенні старанна перамешваюцца. Канцэнтрацыя іх у адным месцы шкодная, бо могуць абпаліцца карэньчыкі. Свежы гной пажадана таксама не ўносіць.

Кожны куст перад пасадкай агледзім. Пашкоджаныя карані абразаем да здаровай тканіны, мачаем у мяшанку гліны і каравяку (прапорцыя 2:1). Саджаем з нахілам і некалькі глыбей, чым раслі раней. Карані распраўляем. Не дапускаецца скручванне іх, згортванне ў нейкія «трубачкі». Прысыпаем зямлёй і злёгку абціскаем. Яшчэ дасыпаем зямлю. Добра паліваем — да вядра на куст.

І ўсё? Не. Зноў бяром у рукі сякатар і праводзім абрэзку. Гэта аперацыя для расліны не балючая, а карысць ад яе велізарная, бо будуць моцныя і «хуткія» атожылкі. Кожны кусцік падрэжам на дзве-тры (можна адну) моцныя пупышкі. Абрэзаныя часткі выкарыстоўваем для вырошчвання новай расады (глядзі папярэдні выпуск).

Нам засталося замульчываць ямкі торфам ці апілкамі. Чакаем вясны і росту...

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92).

Выспее чарнушка

Пакуль што праблем з цыбуляй няма. На базары і ў магазінах поўна горкай прадукцыі на любы густ. Але і да багацця будзем адносіцца беражліва.

Цяпер многія хочуць мець насенне, вырашчанае ўласнымі рукамі. Пытанне адно: як гэта зрабіць? Вялікіх сакрэтаў тут няма. Якраз час падумаць пра пасадачны матэрыял — так званую матчыну цыбуліну. Адбіраем калівы сярэдняга ці крышачку большага памеру. Строга па сартах. У нас добры вынік даюць «штутгартэн» (нямецкая селекцыя) і нашы — «стрыгуноўская» і «мячкаўская». Захоўваем іх асобна. Змяшчаем у картонныя скрынкачкі — і ў сухое, але халоднае памяшканне з тэмпературай 1—5 градусаў цяпла. Вільготнасць паветра—75—80 працэнтаў. Праз тыдзень ці крыху больш схованкі аглядаем і выбракоўваем хворыя экземпляры і тыя, якія крануліся ў рост. Гэта для ўраджаю-93.

А сёлета насенныя парасончыкі (глядзі здымак) ужо выспелі. Кветачкі, што так прываблівалі пчол, вос і чмялёў, закрыліся. І там адбываецца цуд: выспявае чарнушка — дзіця святла, вільгаці і цяпла. Кожная гарошынка, дзе стаілася насенне, на тоненькай жылцы. Як толькі асобныя гарошыны расколюцца, выпадзе чорнае семя. Гэта сігнал да збору. Зразаем усе галоўкі на 10—20 сантыметраў і змяшчаем на цёплым гарышчы, якое добра праветрываецца. Пад пучкі-снопікі падсцелем паперу ці нейкі іншы матэрыял. Гэта для таго, каб не страціць насенне, якое будзе «малаціцца» само.

Як толькі ўсё добра высахне, парасончыкі абмалочваем. Канчатковую апрацоўку робім так. Надзенем гаспадарчыя рукавіцы і дастаткова старанна

вратром гарошынкі паміж далонямі. Аперацыю даводзіцца паўтарыць некалькі разоў, каб атрымаць добры вынік.

Чорнае насенне трэба праветрыць на слабым ветры. Самае важкае, што потым дасць найлепшыя вынікі, будзе падаць на паперу адразу. Больш лёгкае адляціць далей. Зусім пустое наогул панясе вецер. За ім не будзем ганяцца.

Чарнушку захоўваем у папяровых пакетах. На іх алоўкам (не хімічным!) напісаны сорт і дата. Некалькі гадоў насенне добра захоўваецца ў звычайным жылым пакоі падалей ад батарэй ацяплення ці печаў. Вільготнасць насення — да 10 працэнтаў.

Духмяная антонаўка

З сённяшняга выпуску расказваем пра сарты насенных і костачкавых культур. І першым разглядаем яблыню сорту антонаўка звычайная.

Гэта наша гордасць і боль. Гордасць, бо, лагодная і не вельмі патрабавальная да глебаў і зон рассялення, яна ўвайшла літаральна ў кожны дом. Жоўтыя тугія яблыкі праз тыдзень-другі захоўвання выдзяляюць такі пах, што галава ідзе кругам. А які смачны вылежалы яблык. І які карысны для здароўя. У Клецкім раёне, дзе гэты сорт асабліва ў пашане, бы казку-быль перадаюць з пакалення ў пакаленне захапленне антонаўкай нават англійскай каралеўскай сям'і. Быццам спецыяльныя ганцы закуплялі і морам (баявымі фрэгатамі) дастаўлялі на востраў наш залаты скарб.

Плады антонаўкі мочаць (для гэтай справы прыдатныя толькі яны!), сушаць, ставяць кампоты, з іх выціскаюць сок. Сама яблыня, бы тая клапатлівая маці, ахвотна прымае прышчэпкі. На яе аснове выведзены новыя выдатныя сарты.

Боль, бо на нашу прыгажуню сталі глядзець скоса. Маўляў, плады дрэнна захоўваюцца. А між тым адзін яе падвід—камянічка — ляжыць ці не да першага веснавога капяжу! Не так даўно сяляне цяперашняга Пухавіцкага раёна да сенакосу (!) хавалі яблыкі ў спецыяльных капцах, абабітых карой бярозы (цвікі — таксама драўляныя).

Антонаўка не «заседжваецца ў дзеўках», ужо на пяты год пасля пасадкі дае першыя плады. Дрэва вырастае моцнае. Можа радаваць ураджаем да стогадовага ўзросту! Хоць з часам ураджайнасць хістаецца: год — цудоўная аддача, наступны — значна слабейшая. Ніколі не вымярзае. Паршой — гэтым лютым ворагам саду — паражаецца ў нязначнай ступені.

ВЫКАРЫСТАЕМ НА ЎГНАЕННЕ

Сёлетнім гарачым летам шмат дзе былі пажары. Полымя знішчыла лес, ягаднікі, мох, лісце, ігліцу. Усё гэта — выдатнае ўгнаенне для садоў і агародаў. Попел набліжаны да ліставых парод. У ім шмат калію, кальцыю, ёсць фосфар, хоць і ў меншай ступені. Шмат мікраэлементаў.

Гэта ўгнаенне дасць адметны вынік на будучых пасадках бульбы, буракоў — сталовых, кармавых і цукровых, памідораў, фасолі, агуркоў, іншых культур. Можна яго закласці ў кампосты. Яны «памножаць сілу» будучай арганікі. Патрэбна спяшацца, бо дажджы вымываюць самае карыснае.

Многія баяцца яго прымяняць, баюцца ўзбуджальнікаў розных гніляў. І дарэмна. Высокая тэмпература вынішчыла ўсё. А калі дзе-нідзе ёсць «здаровыя» часткі, яны абязшкоджаны.

Памятаць толькі пра Чарнобыль. Радыенукліды засталіся некранутымі, тэрмін іх паўраспаду яшчэ далёка.

Сухое лета «выпаліла» маленькія сажалкі-лужыны. Там — сапрапель. Гэта таксама вельмі каштоўнае ўгнаенне. Не абыдзем і яго ўвагай. Тым больш, што яно прыдатнае для розных глебаў.

ШАХМАТЫ

ДРУГІ КВАРТАЛЬНЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 9
В. Зайцаў, Л. Тамко9 (Гомель)



Белыя: Крd6, Сd1, Кb3, Кf3 (4).
Чорныя: Крf5, Лg3, п. b2 (3).
Кааператыўны мат за 3 хады.
Блізкія Крl8→с3

Заданне № 10
М. Храмцэвіч (Бабруйск)



Белыя: Крf1, Фb5, Лg1, Сf2, Сh7, Кf6, Кg5, пп. d4, g2, h2, h4 (11).
Чорныя: Крf4, Фa1, Лb2, Лd2, Сa6, Сe1, Кb7, пп: a2, c3, f5, g4 (11).
Адваротны мат за 2 хады.

У задачы на кааператыўны мат чорныя пачынаюць і «дапамагаюць» белым заматаваць чорнага караля, а ў задачы на адваротны мат белыя пачынаюць і «прымушаюць» чорных аб'явіць белым мат.

ВЫЙШАЎ У СВЕТ

першы штоквартальны часопіс «Шахматная кампазіцыя», заснавальнікам якога стаў калектыў кансультацыйна-камерцыйнага прадпрыемства «Ліга».

У рэдакцыйную калегію часопіса ўваходзяць вядомыя шахматныя кампазітары: А. Грын (Гуляеў) — старшыня, Я. Уладзіміраў — рэдактар часопіса, Д. Банны, А. Казанцаў, А. Калінін, В. Капаеў, І. Ляпуноў, К. Маркаў, А. Перваноў, Н. Плаксін, Г. Умноў, Р. Яўсееў.

На старонках першага нумара часопіса шмат цікавых артыкулаў па ўсіх жанрах кампазіцыі.

Аб'яўлены новыя конкурсы складання кампазіцый. Свае творы па артадаксальных жанрах дасылайце па адрасу: 123479, Масква, Д-479, вул. Рогава, д. 6, кв. 37, Маркаву К. П.

ФАКУЛЬТЭТ ДАВУЗАЎСКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАФАРЫЕНТАЦЫІ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

ЗАПРАШАЕ НА КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПАСТУПЛЕННЯ ВА ЎНІВЕРСІТЭТ НА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:

беларуская мова і літаратура; руская мова і літаратура; беларуская і руская мова і літаратура; журналістыка; гісторыя; архівазнаўства і музеязнаўства; міжнародныя адносіны; філасофія; эканоміка; сацыялогія; паліталогія; правазнаўства; геаграфія; біялогія; хімія; радыёфізіка і электроніка; фізіка; матэматыка; матэматычная электроніка; механіка; прыкладная матэматыка; матэматычнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм; эканамічная кібернетыка.

НАВУЧАННЕ НА КУРСАХ ВЯДЗЕЦЦА ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫМІ ВЫКЛАДЧЫКАМІ БДУ ПА СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ПРАГРАМАХ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ.

Штогод кожны другі слухач, які добрасумленна займаўся на курсах, паспяхова здае ўступныя экзамены і становіцца студэнтам універсітэта.

НА ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю, вучні 11-х класаў сярэдніх школ, выпускнікі тэхнікумаў і вучылішчаў.

Слухачы завочных курсаў выконваюць кантрольныя работы, забяспечваюцца метадычнымі ўказаннямі, кантрольнымі заданнямі, праграмамі ўступных экзаменаў, некаторымі дапаможнікамі па вывучаемых дысцыплінах. Тыя, хто паспяхова выканаў усе кантрольныя работы, выклікаюцца ў ліпені 1993 г. на дзённыя курсы бясплатна.

Кошт навучання — 1.000 рублёў.

Пачатак заняткаў — па меры атрымання з курсаў заданняў і іншых матэрыялаў.

Інтэрнат на перыяд навучання на курсах не прадастаўляецца.

Прыём дакументаў — з 1 верасня па 1 лістапада (па пошце накіроўваць на адрас: 220050, Мінск, Белдзяржуніверсітэт, падрыхтоўчыя курсы); можна падаваць асабіста (час прыёму — з 9.00 да 17.00 штодзённа, акрамя нядзелі; у суботу — з 9.00 да 14.00).

НА ВЯЧЭРНІЯ КУРСЫ прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю, вучні 10-х, 11-х класаў сярэдніх школ, выпускнікі тэхнікумаў і вучылішчаў г. Мінска [даведкі па тэл. 26-45-04].

Жадаючыя займацца на курсах падаюць заяву на імя рэктара, у якой указваюць: прозвішча, імя, імя па бацьку, дамашні адрас, паштовы індэкс, выбраную для паступлення ва ўніверсітэт спецыяльнасць, наяўнасць адзнакі па беларускай мове ў атэстаце аб сярэдняй адукацыі, вывучаемую замежную мову (для паступаючых на гуманітарныя спецыяльнасці).

Паступаючыя на спецыяльнасць беларуская і руская мова і літаратура ўказваюць, на якой мове будуць пісаць сачыненне — беларускай ці рускай; паступаючыя на спецыяльнасць хімія ўказваюць аддзяленне (выторчае ці педагагічнае); паступаючыя на спецыяльнасці гісторыя, правазнаўства таксама ўказваюць аддзяленне (беларускае ці рускамоўнае).

Да заявы прыкладаецца квітанцыя аб пераводзе грошай.

У выпадку выбыцця слухачоў плата за навучанне пасля пачатку заняткаў не вяртаецца.

Аплату рабіць паштовым пераводам на адрас: 220008, Мінск, Гарадская дырэкцыя Мінскбізнесбанка, разліковы рахунак № 100609430, код 764, БДУ, курсы.

АДРАС КУРСАЎ:
220050, Г. МІНСК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 7, ПАКОІ №№ 311, 312, 313. ТЭЛЕФОН: 26-45-04.

Рэктарат.

Міхаіл

52 гады, 176, беларус. Разведзены, без дзяцей. Жадаю пазнаёміцца з жанчынай да 40, якая не мае дзяцей, але жадае мець. Умовы: бацькі беларусы, пераезд у Алма-Ату, згода разам вучыць казахскую мову. Жыллём забяспечаны. ПІСАЦЬ

(з фотакарткай) па адрасу: 480084, г. Алма-Ата, І мікрараён, дом 58, кв. 46.

НА ДВОР'Е

9 верасня

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праяснеццямі надвор'е. Месцамі невялікі дождж. Тэмпература паветра ў Віцебску —13—15, Мінску — 14—16, Гродна, Магілёве — 15—17, Гомелі—16—18, Брэсце — 17—19 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

9 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Аўтапартрэт з кветкамі». Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 11 клас.
9.35. Творчае аб'яднанне МЭТА. Культура.
16.30. Навіны.
16.35. У. Машкоў. «Апошнія дні матрыярхату». Тэлеспектакль.
18.00. Дак. фільмы «Гімназісты». «Жывапісу майстар у сваёй галіне».
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.10. Будучыя афіцэры: «Прысягаем Беларусі!» Мінск, плошча Незалежнасці, 6 верасня.
19.55. «Песня жытнёвага поля».
20.10. «Я ад вас далёка...» Памяці Янкі Купалы.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. «Двое і адна». Маст. фільм.

Канал «Астанкіна»

8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. Новае пакаленне выбірае.
10.40. А. Хачатурян. Сюіта з музыкі да драмы М. Лермантава «Маскарад».
11.00 Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Вяртанне Будулая». Тэлевізійны чатырохсерыйны маст. фільм. 2-я серыя.
12.40. «Дзень добры, доктар!» Тэлевізійны маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. На III Міжнародным фестывалі тэлепраграм для дзяцей і юнацтва.
16.15. Касмічны марафон.
17.00. Навіны.
17.20. Дак. фільм «Крыж айца Аляксандра».
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. «Вялікая прагулка». 60 мінут у свеце тэлебачання.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Маст. фільм «Хемінгуэй». 4-я серыя.
22.20. «Тайна ядзернай зброі». Перадача 2-я.
23.00. Навіны.

Канал «Расія»

10.20. С. Какоўкін. «Ідзі да мяне». Тэлеспектакль.
11.35. Праграма «Ключ».
11.50. «Санта-Барбара».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Казырная дама.
15.30. Іграе гітарыст Анатоль Болатаў.
16.00. Хрысціянская праграма. «Нагорная пропаведзь. Блажэнны гнаныя...»
16.30. Там-там навіны.
16.45. Далёкі Усход.
17.30. М-трэст.
17.45. Давайце разбяромся.
18.00. Рускія песні і рамансы.
18.25. «Аляксандр Мень: хроніка нераскрытага забойства».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара».
20.20. «Ралі Монтэ-Карла». Чэмпіянат свету па аўтаралі.
20.50. «У дзень, незабыўны для Расіі...» Праграма, прысвечаная 180-годдзю Барадзінскай бітвы.
22.00. Весткі.
22.20. «Шматкроп'е над «і». Перадача 2-я.
22.50. Тэма з варыяцыямі. Канцэрт духоўнай рок-музыкі.

10 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Двое і адна». Маст. фільм.
10.10. Жані. Аб дабрачынным дзейнасці на Беларусі французскай настаўніцы Жані Арнегі.
16.30. Навіны.
16.35. Беларуская літаратура. 10 клас.
17.15. «Пра кацяня Жэню і правілы руху», «Сапраўдныя сябры», «Уладары маланак», «Падарунак для слана». Мультфільмы.
18.00. Дак. фільм «Заложнікі».
18.30. Зачытайце маё пісьмо...
18.35. Як пачаць уласную справу. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.05. Абласныя навіны (Гродна).
19.15. Міжнацыянальная хакейная ліга. «Дынама» (Мінск) — СКА (Санкт-Пецярбург). У перапынку (19.55) — Тыдзень беларускага ўрада.
20.50. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Творчае маладзёжнае аб'яднанне «Крок» прадстаўляе...
23.30. Бізнесклуб «Партнёр» прапануе... дабрачынны тэлеаўкцыён.
23.35. НІКа.
23.50. Бізнесклуб «Партнёр». Перадача 3-я.

Канал «Астанкіна»

5.30. Раніца.
7.50. «Суседзі». Мультфільм.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. Касмічны марафон.
10.30. Відавочнае—неверагоднае.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. «Вяртанне Будулая». Маст. фільм. 3-я серыя.
12.25. «Дзень без чысла». Маст. фільм.
12.55. «Лятучая мыш». Маст. фільм. 1-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. Уолт Дысней прадстаўляе...
16.05. На III Міжнародным фестывалі тэлепраграм для дзяцей і юнацтва.
16.15. Наш музычны клуб.
17.00. Навіны.
17.25. «Дзяўчынка і клоун». Мультфільм.
17.35. ...Да 16 і старэйшым.
18.15. «Багатыя таксама плачуць».
19.00. «Партрэт на фоне». Грузія. Жнівень—верасень.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40 «Еўропа плюс... і плюс... і плюс...»
21.50. Хакей. Кубак лігі. «Дынама» (Масква) — ЦСКА.
23.00. Навіны.
23.25. Праграма талебачання Японіі. «Свята аголеных».
0.10. «Лятучая мыш». Маст. фільм.

Канал «Расія»

11.50. «Санта-Барбара».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Расія—Японія: шляхі супрацоўніцтва.
15.30. Пілігрым.
16.30. Там-там навіны.
16.45. Маленькія музычныя вечары. «Успамінаючы Вярцінскага».
17.15. Панарама прыватызацыі.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Крымінальныя весткі.
19.45. Вялікая нарада.
20.05. «Санта-Барбара».
21.00. На палітычным Алімпе. Урокі Р. Яўлінскага і В. Нямцова.
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.25. На палітычным Алімпе. Працяг.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін —32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.